Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 САКАВІКА 2016 г. ЧАЦВЕР № 44 (28154) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аўтызм — гэта не прысуд

Магніт, небяспечны для... рыбакоў

СТАР. 3

Дзе шукаць канфіскат?

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва:

«Памеры датацый пуцёўкі для дзяцей у лагеры на сёлетніх летніх канікулах узрастуць. На гэтыя мэты плануецца накіраваць больш за Br340 млрд. Са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання на патанненне адной пуцёўкі ў аздараўленчыя, спартыўна-аздараўленчыя лагеры з кругласутачным знаходжаннем будзе накіравана Br1 млн 600 тыс. (летась было Br1 млн 400 тыс.), з дзённым знаходжаннем — Br660 тыс. (было Br580 тыс.), у профільныя аздараўленчыя лагеры з кругласутачным знаходжаннем тэрмінам не менш як 9 дзён — Br680 тыс. (было Br600 тыс.), у лагеры працы і адпачынку з дзённым знаходжаннем — Br740 тыс. (было Br650 тыс.)».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.03.2016 г.

Долар ЗША	20985,00	▼
Еўра	23033,00	▼
Рас. руб.	289,87	▲
Укр. грыўня	799,43	▼

ISSN 1990 - 763X

16044

УСІМ ДРАНІКАМ ДРАНІК!

Фота БЕЛТА.

Пачатак Масленічнага тыдня ў Стаўбцоўскім раёне адзначылі з размахам. У адроджанай шляхецкай сядзібе XVIII стагоддзя Сула падчас святочных ігрышчаў спяклі вялізны дранік. Каб засмажыць гэта кулінарнае дзіва зверху, давялося майстраваць над ім вялізную патэльню з вуголлямі, бо перавярнуць на другі бок «аладку» дыяметрам у некалькі метраў было немагчыма. Але затое пакаштаваць яе змаглі ўсе ахвотныя.

■ 50+

БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

Назавіце сучасную 60-гадовую жанчыну бабулькай — пакрыўдзіцца, і будзе мець рацыю

Аўтар «Боскай камедыі» Дантэ Аліг'еры лічыў, што старасць надыходзіць у 45 гадоў. Скажыце гэта каму-небудзь цяпер — убачыце ў лепшым выпадку здзіўлены позірк у адказ. Тое, што зараз у параўнанні з мінулым значна выросла працягласць жыцця — ні для каго не сакрэт. Але гэта не проста значыць, што пажылыя людзі даўжэй жывуць. Старасць як узроставы этап зрушылася ў часе — цяпер яна пачынаецца нашмат пазней. Калі ў двух словах, то ААН і сусветная навуковая супольнасць цяпер лічаць узростам старасці 60+. А вось калі больш дакладна, то людзей ва ўзросце ад 60 да 75 гадоў адносяць да ліку пажылых, пачынаючы з 75 гадоў — да людзей старэчага ўзросту, з 90 гадоў — да доўгажыхароў.

СТАР. 4

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Спажывец

«МЕХАНІЧНАЕ ПАШКОДЖАННЕ» — ДОБРАЯ АДПІСКА,

або Як не набыць няякасную тэхніку?

Набываеце новенькі тэлевізар, заказалі дастаўку? Але, калі высветлілася, што тавар вам дастаўся з дэфектам, прадавец адмовіўся замяніць яго на якасны? Падобных скаргаў, на жаль, сёння паступае шмат. Калі я звярнулася ў Мінскае таварыства спажыўцоў, каб атрымаць парады, як застрахаваць сябе ад сапсаваных пакупак, там якраз разбіралі падобную сітуацыю. Адна з крам, якая гандлюе складанымі тэхнічнымі тавамі, адмаўляла пакупніку ў замене і не збіралася вяртаць грошы, абвінавачвала ў тым, што ён сам пашкодзіў свой тэлевізар. Маўляў, прычына, няспраўнасці — механічны ўдар. Але навошта чалавеку, які аддаў 25 мільёнаў, ламаць новую тэхніку? Затое пры такім падыходзе магазіна атрымлівалася, што рамантаваць няякасны тавар спажыўцу давядзецца за ўласныя грошы.

«Механічнае пашкоджанне» — добрая адпіска для гандлёвых прадпрыемстваў, каб пазбавіцца ад абураных пакупнікоў. Прычым такія адказы атрымліваюць уладальнікі вялікай колькасці разнастайных рэчаў: мабільных тэлефонаў, планшэтаў, халадзільнікаў, газавых пліт, пральных машын, халадзільнікаў, тэлевізараў. Калі вы набылі тавар, якім немагчыма карыстацца, у дадатак з дыягназам «механічнае пашкоджанне», нават ніхто разбірацца не будзе, калі ён быў сапсаваны — у час дастаўкі, альбо вам заведама прадалі няякасную рэч.

СТАР. 4

ТОНКАЯ ПРАБЛЕМА

Беларусь выступае за пастаянны дыялог з Еўрапейскім саюзам у галіне правоў чалавека. Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы са спецыяльным прадстаўніком ЕС па правах чалавека Стаўрасам Ламбрынідзісам.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў такой тонкай праблеме, як правы чалавека, не ўдасца разабрацца за кошт асобных, разавых мерапрыемстваў. «Патрэбны пастаянны дыялог, пастаянныя кантакты, таму што гэта праблема эканамічнага і глыбока псіхалагічнага характару. І адыходзіць ад пастаяннага дыялогу нельга, таму што нічога ў выніку не атрымаецца», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што Беларусь і ЕС часам забывалі пра такі нармальны дыялог, і выказаў задавальненне тым, што бакі адышлі ад лабавога процістаяння. Аляксандр Лукашэнка спадзяецца, што адышоў у нябыт перыяд, калі ЕС і Беларусь, пабудаваўшы паміж сабой незразумелую сцяну, спрабавалі цераз гэту агароджу нават не размаўляць, а абменьвацца фразамі. «Мы вітаем тое, што Еўропа цяпер убачыла Беларусь, ацаніла яе і мы можам наладжваць нармальнае гандлёва-эканамічнае, інвестыцыйнае супрацоўніцтва», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што гэта абавязкова прывядзе да сур'ёзных зрухаў і па іншых кірунках, паколькі вырашэнне гуманітарных праблем непасрэдна залежыць ад стану спраў у эканоміцы. Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што па меры развіцця гандлёва-эканамічных адносін многія пытанні гуманітарнага характару, у тым ліку правоў чалавека, здымуцца самі сабой.

Прэзідэнт разлічвае, што ў час візіту спецпрадстаўніка ЕС у Беларусь у бакоў будзе магчымасць разабрацца ў праблемах, якія ўзнікаюць у двухбаковых адносінах у гуманітарнай сферы, вызначыцца па некаторых разыходжаннях у тэрмінах і паняццях.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што не крытыкуе Еўропу за тое, як яна разумее правы чалавека. Але разам з тым звярнуў увагу, што ў Беларусі ёсць свой погляд на гэтыя і іншыя актуальныя пытанні гуманітарнай сферы. «Вырашэнне гэтых праблем ляжыць у плоскасці жыцця людзей, і перш за ўсё матэрыяльнай. Мы так гэта разумеем», — сказаў Прэзідэнт.

У сваю чаргу Стаўрас Ламбрынідзіс запэўніў Аляксандра Лукашэнку, што ў ЕС, як і ў Беларусі, не разглядаюць тэму правоў чалавека асобна ад эканамічных пытанняў. «Мы лічым, што зрухі ў гэтай галіне будуць звязаны непасрэдным чынам, напрыклад, з замежнымі інвестыцыямі і з узаемадзеяннем у гандлёва-эканамічнай сферы», — адзначыў спецпрадстаўнік ЕС. Еўрасаюз, паводле слоў Стаўраса Ламбрынідзіса, разлічвае істотна нарасціць узаемадзеянне з Беларуссю ва ўсіх сферах.

Золатавалютныя рэзервы пачалі павялічвацца

Па выніках лютага золатавалютныя рэзервы Беларусі ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду павялічыліся на 84,2 млн долараў. Таму, паводле інфармацыі прэс-службы Нацыянальнага банка Беларусі, па стане на 1 сакавіка такія рэзервы краіны склалі 4 млрд 111 млн долараў.

У нацыянальным вызначэнні аб'ём ЗРВ павялічыўся на 99,5 млн долараў і на 1 сакавіка склаў 4 млрд 375,2 млн долараў у эквіваленце. Падтрыманню золатавалютных рэзерваў спрыялі паступленне сродкаў ад продажу Мінфінам і Нацбанкам Беларусі аблігацый, намінаваных у замежнай валюце, павелічэнне кошту золата на міжнародным рынку каштоўных металаў, купля рэгулятарам валюты на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы, а таксама паступленні ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

ЗАЎСЁДЫ ГАТОВЫ ДА ДЫЯЛОГУ

Уладзімір Андрэйчанка сустрэўся са спецпрадстаўніком Еўрасаюза па правах чалавека

Наша дзяржава зацікаўлена ў наладжванні канструктыўных, нармальных адносін з Еўрапейскім саюзам. На гэтым зрабіў акцэнт Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў, падчас сустрэчы са спецыяльным прадстаўніком Еўрапейскага саюза па правах чалавека Стаўрасам Ламбрынідзісам, які наведаў нашу краіну ўпершыню.

— Мы разлічваем, што візіт вашай прадстаўнічай дэлегацыі надасць дадатковы імпульс развіццю гэтых стасункаў, — выказаў спадзяванні старшыня ніжняй палаты. — Мы пачынаем не з чыстай старонкі, у нас у плане ўзаемадзеяння ўжо шмат што зроблена.

Ён з задавальненнем канстатаваў той факт, што знешнегандлёвы абарот па выніках 2015 года паміж Беларуссю і краінамі — членамі Еўрасаюза склаўся ў аб'ёме амаль 15 мільярдаў долараў. З гэтых дзяржаў за мінулы год да нас паступіла 5,5 мільярда долараў інвестыцый.

Спікер беларускага парламента звярнуў увагу на тое, што наша краіна прымае ўдзел у ініцыятыве Еўрапейскага саюза «Усходняе партнёрства», зараз сумесна з Еўракамісіяй распрацоўваецца шэраг пагадненняў аб спрашчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі. Заўсёды падтрымліваліся пастаянныя кантакты паміж міністэрствамі, ведамствамі нашай краіны і краін Еўрапейскага саюза. У баку ад гэтых працэсаў не стаяць і дэпутаты Нацыянальнага сходу, якія пастаянна ўдзельнічаюць у працы Парламенцкай асамблеі АБСЕ.

— Мы вітаем рашэнне Савета Еўрапейскага саюза па адмене абмежавальных мер у адносінах да Беларусі і лічым, што гэта крок у правільным кірунку, — заявіў Уладзімір Андрэйчанка. — Гэта рашэнне дасць сур'ёзны стымул для развіцця адносін паміж нашымі дзелавымі, палітычнымі коламі.

Па словах старшыні Палаты прадстаўнікоў, такі крок з боку Еўрасаюза вельмі станоўча ўспрымаецца грамадскасцю нашай дзяржавы, краін Еўропы.

— У нас ёсць вельмі добрая магчымасць вывесці нашы адносіны на новы, больш высокі ўзровень, — упэўнены Уладзімір Андрэйчанка. — Добра, што мы выходзім з той закасцянелай сітуацыі, у якой знаходзіліся апошні час. Рэспубліка Беларусь заўсёды гатова да канструктыўнага, узаемавыгаднага, паважлівага дыялогу па любых кірунках, у тым ліку і па праблематыцы правоў чалавека.

Уладзімір Андрэйчанка таксама паведаміў, што ў дзяржаве распрацоўваецца праект Нацыянальнага плана дзеянняў па правах чалавека, які асноўваецца на рэкамендацыях, дадзеных Саветам па правах чалавека ААН.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■ Тры пытанні да ўлады

АГУЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

Сёння экалогіі надаецца асаблівая ўвага ў свеце ў цэлым і ў Еўропе ў прыватнасці, бо сучасны чалавек як ніводнае папярэдняе пакаленне адчуў на сабе і наступствы змянення клімату, і горыч забруджвання планеты прадуктамі сваёй жыццядзейнасці. «Звязда» пацікавілася, пра што найбольш клапоцяцца эколагі «краю азёр». Наш суразмоўца — старшыня Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Руслан ВІНАКУРАЎ.

— Руслан Васілевіч, наколькі часта да эколагаў звяртаюцца людзі і з якімі пытаннямі?

— Людзі да нас звяртаюцца як падчас прыёмаў грамадзян, так і іншымі спосабамі. Гэта дапамагае і выявіць праблемы, і вырашыць іх своечасова. У 2015 годзе камітэт і інспекцыі правялі 360 прыёмаў грамадзян, у тым ліку 60 выязных. Паступіў 201 зварот, у тым ліку 29 электронных. У параўнанні з 2014 годам, колькасць зваротаў зменшылася на 20%.

Пераважалі звароты па навядзенні парадку на зямлі і высечцы драўнянахмызняковай расліннасці — 43%; па арганізацыі збору і вывазу адходаў — 10%. Праблема забруджвання водных рэсурсаў турбавала 11% тых, хто звярнуўся.

Жыхар Оршы, напрыклад, паведаміў, што ў лесапаркавай зоне козы аб'ядаюць ствалы дрэў. Нам, на жаль, не ўдалося ўстанавіць, чые козы нанеслі шкоду прыродзе. Дарэчы, за незаконнае знішчэнне або пашкоджанне дрэў, кустоў, кветнікаў, газонаў, размешчаных на землях населеных пунктаў, у адпаведнасці з часткай 3 артыкула 15.22 КаАП Рэспублікі Беларусь прадугледжаны штраф памерам да 50 базавых велічынь.

— Як часта летась парушалася прыродаахоўнае заканадаўства?

— Камітэтам праведзена амаль 340 праверак суб'ектаў гаспадарання. Правялі і 208 пазапланавых праверак. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі 2,7 тысячы правапарушальнікаў. Аштрафавана каля 1,6 тысячы службовых асоб на больш за 1,4 мільярда рублёў. Сярод штрафнікоў 540 юрыдычных асоб. Агульная сума штрафаў, якія яны заплацілі, парадку 1,5 мільярда. 470 грамадзян былі пакараныя на 282 мільёны рублёў.

— За станам Заходняй Дзвіны сочаць эколагі некалькіх краін, у тым ліку суседняй Латвіі. Беларусы тут цесна супрацоўнічаюць і з расіянамі. У якім стане рака, дзякуючы якой Віцебшчыну яшчэ называюць Прыдзвінскім краем?

— Яе стан уважліва кантралюецца. Восенню мінулага года адбылося пасяджэнне сумеснай беларуска-расійскай рабочай групы па басейне ракі Заходняя Дзвіна. Мы абмеркавалі інфармацыю аб стане паверхневых вод на трансгранічных участках вадацёкаў. Былі агучаны вынікі сумесных адбораў проб вады. Абмяркоўвалася і пытанне правядзення міжлабараторнага параўнальнага аналізу. Была дадзена ацэнка стану і якасці паверхневых вод трансгранічных рэк: Усвяча, Обаль, Ушча, возера Езярышча.

Кантралюецца і ўплыў на раку і ў цэлым на навакольнае асяроддзе, які аказваюць буйныя свінагадоўчыя комплексы ў Пскоўскай вобласці Расіі. На жаль, яны ўяўляюць сабой небяспеку. Вырашылі працягнуць у гэтым годзе актыўнае супрацоўніцтва, каб кантраляваць негатыўныя крыніцы ўздзеяння.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

■ Акцэнты тыдня

ПАЛІТЫЧНЫЯ ГОНКІ І ВЫЗНАЧАЛЬНЫЯ КРОКІ

2 САКАВІКА Савет Бяспекі ААН вырашыў увесці ў дзеянне **санкцыі новага ўзроўню жорсткасці супраць КНДР**. Гэта звязана з тым, што ў пачатку 2016 года Паўночная Карэя правяла выпрабаванне, як мяркуецца, вадароднай бомбы, а затым ажыццявіла пуск балістычнай ракеты далёкага радыуса дзеяння. Паказальна, што аўтарамі новых жорсткіх санкцый выступілі ЗША і Кітай. Паміж гэтымі краінамі шмат сур'ёзных супярэчнасцяў, і дастаткова працяглы час КНР абараняла КНДР ад празмерна жорсткіх мер з боку міжнароднай супольнасці, карыстаючыся сваім статусам пастаяннага члена Савета Бяспекі ААН. Але, на думку аналітыкаў, лідар КНДР не пажадаў прытрымлівацца рэкамендацый з боку Кітая і страціў прыхільнасць Пекіна. За жорсткія санкцыі прагаласавала і Расія, што гаворыць пра тое, што ў КНДР больш няма абаронцаў сярод моцных дзяржаў. 7 сакавіка Пхеньян даў свой адказ на санкцыі, паабяцаўшы нанесці прэвентыўны ядзерны ўдар па Паўднёвай Карэі і ЗША ў выпадку пагрозы для бяспекі краіны.

На мінулым тыдні нафта працягвала дэманстраваць станоўчую дынаміку па росце цэн. Нафта, якая падала ніжэй за ўзровень у 30 долараў у пачатку года, перайшла ў канцы тыдня планку ў **40 долараў за барэль**. Вырашальнае значэнне аказалі дамоўленасці шэрагу краін свету, уключаючы Расію і Венесуэлу, замарозіць здабычу на ўзроўні студзеня 2016 года. Кіраўнік Мінэнерга Расіі Аляксандр Новак заявіў, што да пагаднення далучылася больш як 15 краін, пад кантролем якіх знаходзіцца больш чым 73 працэнты здабычы нафты ў свеце. З сакавіка прэзідэнт Венесуэлы Нікалас Мадура аб'явіў аб дамоўленасці ў бліжэйшыя дні правесці сустрэчу прадстаўнікоў гэтых краін, каб больш падрабязна абгаварыць дэталі замарозкі здабычы. Цэны могуць быць замарожаны, па меншай меры, да чэрвеня гэтага года. Калі дынаміка росту цэн захаваецца, гэта стане станоўчым фактарам як для эканомікі Расіі, так і для Беларусі, значная частка эканомікі якой цесна звязана з нафтахімічнай прамысловасцю.

Мінулы тыдзень стаў адным з вырашальных у **вызначэнні кандыдатаў ад рэспубліканскай і дэмакратычнай партый ЗША** на будучых прэзідэнцкіх выбарах. У рамках «супераўторка» (гэты дзень названы так з прычыны таго, што першасныя выбары кандыдата праходзяць адразу ў адзінаццаці штатах) перамогу атрымалі: ад дэмакратычнай партыі — Хілары Клінтан, ад рэспубліканскай — Дональд Трамп. Дадзеная акалічнасць яшчэ не з'яўляецца поўнай гарантыяй таго, што менавіта гэтыя кандыдаты сустрэнуцца ў фінальным паядынку за пасаду прэзідэнта ЗША, але пераканаўчая перамога ў рамках прайменыз у супераўторак з'яўляецца вельмі сур'ёзнай падставай для таго, каб верыць у гэта. У выпадку рэалізацыі такога сцэнарыя рэспубліканцы апынуцца, як і на папярэдніх выбарах, у нявыгаднай сітуацыі. Іх кандыдат зноў будзе непрымальным для долі выбаршчыкаў, якая ўсё больш расце, з ліку лацінасаў і афраамерыканцаў, уяўляючы сабой тыпаж, непапулярны ў іх колах — багатага пажылога белага мільярдэра. А менавіта галасы гэтых выбаршчыкаў становяцца ўсё больш важнымі для вынікаў любых выбараў у ЗША. Хілары Клінтан, у сваю чаргу, таксама мае ўразлівую асаблівасць — многія выбаршчыкі адзначаюць, што ўжо стаміліся ад палітычных дынастый і хацелі б бачыць свежыя твары на палітычнай сцэне.

5 САКАВІКА было аб'яўлена пра **пачатак ваеннай аперацыі Ірака** пры падтрымцы сіл міжнароднай паветранай кааліцыі па вяртанні пад свой кантроль Масула. Гэты буйны горад (з насельніцтвам, супастаўным з Мінскам) з чэрвеня 2014 года знаходзіцца пад кантролем тэрарыстычнай групоўкі Ісламская дзяржава. Акрамя вялікага насельніцтва, важнасць горада заключаецца і ў тым, што ён з'яўляецца буйным цэнтрам нафтаздабычы і нафтаперапрацоўкі. З гэтай прычыны ён служыць сур'ёзнай крыніцай здабывання фінансавых рэсурсаў, неабходных для паспяховага функцыянавання Ісламскай дзяржавы, і забяспечвае палівам машыны баевікоў.

Чарговы прагрэс быў дасягнуты ў Мінску ў рамках работы **кантактнай групы па Украіне**. У пачатку тыдня былі ўзгоднены дакументы па бяспецы, якія ўключаюць дамоўленасці аб размініраванні ўчасткаў паблізу лініі судакранання ў Данбасе і забарону на правядзенне вучэбнай стральбы ў трыццацікіламетровай зоне ўздоўж лініі размежавання. Новыя дакументы сталі хоць і малым, але важным крокам на шляху да зніжэння напружанасці ў зоне баявых дзеянняў.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

РЭКІ ПАД НАГЛЯДАМ

У Магілёве адбылося першае пасяджэнне Дняпроўскага басейнавага савета

Летась у Беларусі было распрацавана Палажэнне аб парадку дзейнасці басейнавых саветаў. Дняпроўскі стаў першым з пяці, якія плануецца стварыць на тэрыторыі Беларусі. Гэты басейн з'яўляецца самым вялікім у нашай краіне і трансгранічным з Расіяй і Украінай. Таму вельмі важна, каб выконваліся міжнародныя мэтавыя паказчыкі і крытэрыі па якасці вады.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дняпро каля Быхава.

— Стварэнне Дняпроўскага басейнавага савета значная падзея на шляху правядзення гарманізацыі нацыянальнага заканадаўства ў галіне аховы і выкарыстання водаў з заканадаўствам суседніх краін, — адзначыў **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Ігар КАЧАНОЎСКІ.** — Яго дзейнасць накіравана на рэалізацыю прынцыпаў канвенцыі па ахове і выкарыстанні трансгранічных вадацёкаў і міжнародных азёр. Ён будзе служыць механізмам кансалідацыі ўлады і грамадскасці ў прыняцці рашэнняў па кіраванні воднымі рэсурсамі. А таксама спрыяць развіццю больш цеснага міжнароднага супрацоўніцтва з прыцягненнем інвестыцый, накіраваных на аднаўленне і захаванне экалагічнага стану водных аб'ектаў Беларусі. Гэта дасць магчымасць развіццю новых эканамічных зносін, воднага турызму і міжкультурнага дыялогу.

Старшынёй Дняпроўскага басейнавага савета прызначаны першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Алег Чыкіда. На пасяджэнні ў Магілёве былі абмеркаваны ход падрыхтоўкі плана кіравання басейнам ракі Днепр з усімі яе прытокамі, намечаны планы далейшых дзеянняў.

Асноўныя прынцыпы воднай стратэгіі і мэты да 2020 года, якія закладзены ў плане кіравання рачным басейнам Дняпра — аптымізацыя водакарыстання, ахова і аднаўленне вонкавых водных аб'ектаў, забеспячэнне абароненасці ад негатыўнага ўплыву водаў і іншыя. У Магілёўскай вобласці плануецца правесці шэраг мерапрыемстваў для паляпшэння стану басейна Дняпра. У прыватнасці, на рацэ Свіслач у Асіповічах укараніць сучасныя тэхналогіі на ачышчальных збудаваннях і правесці ачыстку вадасховішча ад донных адкладаў. На Бярэзіне ў Асіповіцкім і Бабруйскім раёнах зрабіць рэканструкцыю шэрагу ачышчальных збудаванняў, а таксама пабудаваць воданепранікальную дамбу вакол глеістых карт ва ўрочышчы «Гнядовыя горы».

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

УРАЗІМ ЯПОНІЮ... ЗЕФІРАМ!

Нацыянальная экспазіцыя беларускай харчовай прадукцыі ўпершыню прадстаўлена на найбуйнейшай выставе прадуктаў харчавання і напояў у Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне «Фудэкс Джапан», якая адбываецца з 8 па 11 сакавіка ў Токіа. Гэта ўжо 41-я па ліку Міжнародная выстава ў Японіі.

Аднымі з галоўных удзельнікаў з беларускага боку на ёй сталі такія вядомыя айчынныя прадпрыемствы, як «Камунарка», «Спартак», «Чырвоны харчавік», «Крыніца», «Мінск Крышталь», «Лідскі малочна-кансервавы камбінат», «Лідахлебапрадукт». Беларускія прадпрыемствы прадстаўляюць шырокі асартымент мясной прадукцыі, сухіх малочных прадуктаў, цвёрдых сыроў, макаронных і мучных вырабаў, паўфабрыкатаў, квасу і піва, разнастайных лікёра-гарэлачных вырабаў, настоек і бальзамаў. Найбольш экзатычнымі таварамі для японскага спажыўца абяцаюць быць беларускія зефір, пасціла, мармелад, халва, шакалад, цукеркі і іншыя кандытарскія прадукты. Японія ў сваёй харчовай палітыцы прытрымліваецца курсу на адмову ад выкарыстання генетычна мадыфікаваных сельскагаспадарчых культур і прадуктаў. Менавіта гэта і павінна дапамагчы ў прасоўванні беларускай прадукцыі, якая вядомая ва ўсім свеце сваёй натуральнасцю, на японскі рынак.

Таксама пры садзейнічанні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты і пасольства Беларусі ў Японіі пройдуць прэзентацыі гандлёва-эканамічнага патэнцыялу нашай краіны, кампаній-экспанентаў нацыянальнай экспазіцыі, Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Дзелавая частка праграмы працягнецца на стэндах нацыянальнай экспазіцыі, дзе пройдуць перамовы з патэнцыяльнымі партнёрамі.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *kryzhevich@zviazda.by*

«КАБ БЫЛО НЕ СОРАМНА ГЛЯДЗЕЦЬ У ВОЧЫ...»

«Журналіст павінен кіравацца прынцыпамі адказнасці і прыстойнасці», — упэўнены міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў.

«Папулярнасць журналістыкі як прафесіі вельмі высокая. У той жа час адказнасць журналіста ўзрасла неймаверна. Значэнне мае кожнае слова, асабліва ў сувязі са з'яўленнем электронных СМІ. Вельмі крыўдна, калі журналісты пішуць аб адукацыі ў негатыўным ключы, спрабуюць адшукваць выключна негатыўныя з'явы, — падкрэсліў Міхаіл Жураўкоў падчас брыфінгу, арганізаванага ў рамках «Зімовай школы студэнцкай журналістыкі». — Усе ж былі вучнямі і студэнтамі. І няўжо ва ўсіх былі толькі дрэнныя выкладчыкі і жудасныя ўрокі?»

Міністр адукацыі заклікаў будучых журналістаў бачыць і пазітыўныя моманты і больш актыўна пра іх казаць: «Мне здаецца, што кожны журналіст павінен вызначыць свой уласны ўнутраны маральны кодэкс, каб было не сорамна глядзець у вочы чалавеку, калі з ім сустрэнешся іншым разам».

Міхаіл Жураўкоў таксама пракаментаваў пытанне размеркавання выпускнікоў 2017 года. Паводле яго слоў, створана працоўная група, куды ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства эканомікі. Ужо цяпер вядзецца работа з наймальнікамі, каб усіх выпускнікоў забяспечыць першым працоўным месцам.

Першы намеснік міністра інфармацыі Ігар ЛУЦКІ, які таксама прыняў удзел у брыфінгу, засяродзіў увагу на тым, што ўмовы, у якіх працуюць сучасныя журналісты, патрабуюць ад іх самага высокага прафесіяналізму: «Роля інфармацыі ў грамадстве сур'ёзна ўзрасла. Выкарыстанне сучасных тэхналогій дазваляе максімальна хутка і аператыўна даносіць яе да спажыўца: праз электронныя рэсурсы і сацыяльныя сеткі. У той жа час роля прафесійнай журналістыкі застаецца і заўсёды будзе важная».

Ігар Луцкі паведаміў, што Міністэрства інфармацыі выступае за з'яўленне новых маладзёжных праектаў на тэлебачанні. Крэатыўныя праекты, на яго думку, дазволяць павялічыць долю нацыянальнага кантэнту і пашырыць колькасць праграм уласнай вытворчасці.

У сваю чаргу Міністэрства адукацыі падпісала з Белтэлерадыёкампаніяй пагадненне аб супрацоўніцтве. Галоўнае адукацыйнае ведамства стала партнёрам трох вялікіх праектаў. Адна з новых праграм — тэлевізійная адукацыйна-забаўляльная квэст-гульня для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту. Яшчэ адна праграма ў лёгкай і даступнай форме будзе распавядаць пра адкрыцці, маладзёжную навуку і дасягненні беларускіх вучоных. Плануецца таксама, што Міністэрства адукацыі акажа падтрымку праграме «Размаўляем па-беларуску», якая ўжо выходзіць на тэлебачанні. Удзельнікі віктарыны адказваюць на пытанні на веданне беларускай мовы, літаратуры, этнаграфіі і мастацтва.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

Рыбакі, не трапляйцеся на прынаду!

Магніт «сквапнасці» можа давесці да адказнасці

Напярэдадні вясновага нерасту на многіх беларускіх тэлеканалах з'явіліся відэаролікі, якія рэкламуюць электронную прынаду для лоўлі рыбы «Фішмагніт-2». У ёй усім, хто набыў яе, абяцаюць гарантаваныя ўловы і падманьванне рыбы ў радыусе 900 метраў. Рыбакоў заклікаюць выкарыстоўваць прынаду ў любую пару года. І гэта нягледзячы на тое, што, па Правілах вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, у нераставы перыяд рыбачыць дазволена толькі адной вудай з адным кручком або спінінгам з адным адзінарным або падвойным, або трайным кручком!

— Больш за тое, Правілы ў прынцыпе забараняюць выкарыстоўваць для аматарскага рыбалоўства прылады, прынцыпы работы якіх заснаваны на выкарыстанні электрамагнітнага поля, а таксама ультрагуку. За парушэнне гэтай нормы прадугледжана крымінальная адказнасць (ад буйнога штрафу да пазбаўлення волі) і пакрыццё нанесенай прыродзе шкоды з вылічэннем яе ў пяцікратным памеры! — распавяла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч.

Варта адзначыць, што рэкламадаўца звяртаўся ў Дзяржінспекцыю з пытаннем, ці законнае распаўсюджванне гэтай прадукцыі ў нашай краіне. І хоць сфера рэалізацыі тавараў не адносіцца да кампетэнцыі Дзяржінспекцыі, юрыдычнай асобе быў дадзены адказ з прывядзеннем вытрымак з заканадаўства і вынікаў навуковых даследаванняў пра негатыўны ўплыў электрамагнітнага поля на арганізм рыб. Тым не менш рэкламны ролік выйшаў у эфір.

Спецыялісты Дзяржінспекцыі накіравалі ліст у Міністэрства гандлю з просьбай разгледзець пытанне аб законнасці размяшчэння рэкламы дадзенага тавару ў эфіры агульнадзяржаўных і мясцовых тэлеканалаў і ў выпадку незаконнасці выдаць прадпісанне аб яе забароне.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

■ Здарэнне

Выбух ад... грызуноў

82-гадовы жыхар вёскі Ладзенікі Навагрудскага раёна трапіў у бальніцу пасля выбуху газапаветранай сумесі ў сваім доме. Хто вінаваты?

Аб гэтым здарэнні навагрудскім выратавальнікам паведаміў дыспетчар хуткай медыцынскай дапамогі, і вось што высветлілася. Раніцай пенсіянер накіраваўся ў летнюю кухню, каб падагрэць ваду для гаспадарчых патрэб на ацяпляльна-варачнай печы, дзе знаходзілася і газавая пліта. Звычкі закрываць вентыль газавага балона ў мужчыны не было. Верагодна, за ноч грызуны пашкодзілі гумаватканы рукаў, які злучае балон і пліту. Пах газу гаспадар не адчуў і, запоўніўшы печ дровамі, дастаў запалку... Адбыўся выбух, які разбурыў дзве сцяны летняй кухні і прычыніў мужчыну апёкі твару і рук. Цяпер ён знаходзіцца ў хірургічным аддзяленні раённай бальніцы, стан здавальняючы.

— Для асабістай бяспекі пасля эксплуатацыі газавага абсталявання варта зачыняць вентыль балона, калі ён устаноўлены ў памяшканні. Пры выяўленні паху газу альбо тэхнічных няспраўнасцяў тэлефануйце па нумарах 104 альбо 101 для выкліку спецыялістаў, — папярэджвае прэс-служба Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by

■

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы Палейчуку Аляксандру Іванавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

Калектыў газеты РВУ Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні былым супрацоўнікам газеты «Звязда» Анатолю Васілевічу Дабравольскаму і Наталлі Анатолеўне Махначовай у сувязі з напаткаўшым іх вялікім горам — смерцю ЖОНКІ і МАЦІ МАРЫІ МІХАЙЛАЎНЫ.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «РАПС»

25 марта 2016 года
состоится очередное общее собрание акционеров

ОАО «Рапс»,

расположенного по адресу: Минская обл., Минский район, 223014, аг. Крупица.

Собрание пройдет по адресу:
Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, Административное здание ОАО «Рапс», первый этаж, актовый зал.

Повестка дня собрания:

1. Отчет о работе наблюдательного совета в 2015 году.
2. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2015 году и основных направлениях деятельности Общества на 2016 год.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2015 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении предприятия (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2015 год. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2016 год и 1-й квартал 2017 года.
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Об утверждении решения о выпуске дополнительных акций ОАО «Рапс».
9. Об увеличении размера уставного фонда Общества.
10. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества и утверждении новой редакции Устава Общества.
11. Об утверждении регламента работы Общества с реестрами владельцев ценных бумаг.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: **Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, 20, с 16 по 24 марта 2016 года (время работы с 14.00 до 16.00) либо 25 марта 2016 г. по месту проведения собрания.**

Регистрация участников собрания **с 10.00 до 11.00** по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – **25 марта 2016 г. в 11.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра **на 02 марта 2016 года.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке!

Справки по тел.: 8(017)5069414, 8(017)5069341.

УНП 600068480

В **суд Лидского р-на** поступило заявление об объявлении умершим ПЕЛЕСЫ Николая Владимировича, 28 мая 1957 года рождения, уроженца д. Семашки Лидского района, последнее известное место жительства: г. Лида, ул. Тухачевского, д. 71, кв. 88.

Просьба ко всем гражданам и организациям, которым что-либо известно о Пелесе Николае Владимировиче, сообщить суду Лидского р-на в течение двух месяцев с момента опубликования объявления по тел.: 529 760, 524 441.

Уважаемые акционеры ОАО «Пищевой комбинат «Веселово»

22 марта 2016 г. в 15.00
состоится общее собрание акционеров

ОАО «Пищевой комбинат «Веселово»

по адресу: Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, 24 (актовый зал).

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» в 2015 году и основных направлениях деятельности Общества на 2016 год.
2. Отчет наблюдательного совета ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» о проделанной работе за 2015 год.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии за 2015 год и заключение по бухгалтерскому балансу, отчету прибылей и убытков, годовому отчету ОАО «Пищевой комбинат «Веселово». Ознакомление с заключением аудиторов.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках за 2015 год.
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2015 год. О выплате дивидендов за 2015 год.
6. О направлениях использования чистой прибыли ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» на 2016 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета и членов ревизионной комиссии ОАО «Пищевой комбинат «Веселово».
8. О назначении материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии, за исполнение ими своих обязанностей.

Список участников собрания будет сформирован по состоянию реестра **на 01 марта 2016 г.**

Регистрация участников собрания будет проводиться **с 14.00 до 14.45** по месту проведения собрания.

С материалами собрания можно ознакомиться по адресу: **Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, 24.**

Для регистрации участникам собрания при себе необходимо иметь паспорт (для представителя акционера – паспорт и доверенность).

СПРАВКИ ПО ТЕЛЕФОНУ (80177) 93 34 10.

УНП 690277551

БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Час, у які мы жывём, шмат у чым унікальны, і ў тым ліку тым, што ніколі яшчэ ў гісторыі чалавецтва не было такога, каб пажылых людзей у грамадстве было больш, чым дзяцей. Цяпер мы ўшчыльную наблізіліся да такога стану спраў.

Эксперты сцвярджаюць, што да 2050 года доля пажылых людзей у свеце падвоіцца і складзе прыкладна 22% ад усяго насельніцтва планеты. А вось айчынныя спецыялісты прагназуюць, што ўжо да 2020 года доля пажылых людзей у нашай краіне можа дасягнуць 27%.

КОЖНЫ з нас хацеў бы жыць доўга, але за апошні час парадаксальным чынам атрымалася так, што павелічэнне працягласці жыцця стала нейкай страшылкай нашых дзён. Цяпер шмат пішуць пра падзенне долі працаздольнага насельніцтва і, адпаведна, пра рост нагрузкі на яго ў сувязі з неабходнасцю ўтрымліваць старых. І хоць чалавецтва ніколі яшчэ ў сваёй гісторыі не жыло так сытна, атрымліваецца, што старэнне грамадства — гэта пагроза. Магчыма, так і было б, калі б не адно «але», пра якое мы і напісалі ў пачатку: старасць у XXI стагоддзі, асабліва калі чалавек сочыць за сабой і сваім здароўем, прыходзіць пазней.

Ды і мужчыны ў большасці сваёй у гэтым узросце лічаць, што яны яшчэ «хоць куды»! Цяперашнія 55-60-гадовыя і не выглядаюць, і не адчуваюць сябе пажылымі, ды і патрэбы ў іх яшчэ далёка не як у старых — большасць хочуць быць у гушчы жыцця. А што дае для гэтага лепшыя магчымасці? Як правіла, праца. Яна ж не толькі сродак для выжывання або заробку: гэта і магчымасць мець пэўны сацыяльны статус, пэўную ролю ў грамадстве. Праца дае пачуццё годнасці: успомніце, як часта старыя з гонарам заяўляюць: «Я ўсё жыццё працаваў!» Калі больш не працуеш, то з жыцця сыходзяць мэты і разнастайнасць чалавечых адносін. Таму, нават калі ў гэтым няма неабходнасці, пажылыя людзі імкнуцца знайсці магчымасць працягваць працаваць. Быць занятым, карысным іншым — нагода для самапавагі і найважнейшая ўмова для шчаслівага жыцця.

Цяпер у Беларусі пражываюць 2 мільёны 592,8 тысячы пенсіянераў. З іх 82% — атрымальнікі пенсіі па ўзросце. На стане на 1 студзеня гэтага года 651,2 тысячы пенсіянераў працягваюць працаваць. Сярод працуючых пенсіянераў 90-гадовую мяжу перасягнулі 18 чалавек.

Сёння ў нашай краіне існуе схема адтэрмінаванай пенсіі, калі чалавек пры дасягненні пенсійнага ўзросту сам можа вырашаць, атрымліваць яму выплаты ад дзяржавы зараз ці пазней. Па звестках за восень 2015 года, такім правам скарысталіся больш за 6,2 тысячы пенсіянераў. А многія працягваюць працаваць і атрымліваць пенсію. У любым выпадку права на працу — адно з найважнейшых для чалавека любога ўзросту, і вельмі важна, каб людзі ў пошуках працоўнага месца не сутыкаліся з дыскрымінацыяй па ўзросце.

Дарэчы, **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Зінаіда МАНДРОЎСКАЯ** лічыць, што людзі пэўнага ўзроўню на момант выхаду на пенсію (55-60 гадоў) маюць велізарны назапашаны вопыт, які мае вялікую каштоўнасць для любой арганізацыі. І прапаноўвае ўнесці ў працоўнае заканадаўства пэўныя змены, напрыклад, каб у чалавека, які адмовіўся ад атрымання пенсіі і перайшоў на налічэнне бонусаў, была гарантыя ад працадаўцы, што з ім не будзе спынены працоўны кантракт. Гэтая мера дазволіла б даць больш магчымасцяў пажылым людзям і зняла б стрэсавую сітуацыю, звязаную з большай цяжкасцю працаўладкавання ў гэтым узросце.

МІЖ іншым, пажылы ўзрост зусім не накладвае абмежаванняў і на асабістае жыццё. Так, згодна з інфармацыяй Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі, у нашай краіне ў 2014 годзе шлюбны саюз у сталым узросце заключылі 1010 жанчын і 1560 мужчын. Пры гэтым у 779 выпадках і жаніх і нявеста былі ва ўзросце 60 гадоў і старэйшыя.

Беларускія пенсіянеры актыўна асвойваюць і новыя тэхналогіі. Паводле дадзеных выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак па ўзроўні жыцця, людзі старэйшага ўзросту ўсё больш актыўна выкарыстоўваюць інтэрнэт, асвойваюць смартфоны і планшэты. Яшчэ ў 2014 годзе доля карыстальнікаў камп'ютара і, у прыватнасці, Глабальнай сеткі сярод людзей старэйшых за працаздольны ўзрост склала 20,9%. Сярод пажылых гараджан інтэрнэтам карыстаюцца 25,2%, сярод пажылых вяскоўцаў — 10,8%. Пры гэтым большасць пажылых карыстальнікаў заходзяць у інтэрнэт штодня. І навіны чытаюць, і ў форумах актыўна ўдзельнічаюць. Так што беларусы старэйшага ўзросту ў большасці сваёй не адстаюць ад сучаснага жыцця.

Святлана БУСЬКО. *busko@zviazda.by*

«МЕХАНІЧНАЕ ПАШКОДЖАННЕ» — ДОБРАЯ АДПІСКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Вызначылася тэндэнцыя некарэктных паводзін, калі гандлёвыя прадпрыемствы знайшлі слабае звяно ў абароне правоў спажыўцоў, — заўважае **старшыня праўлення грамадскага аб'яднання «Мінскае таварыства спажыўцоў» Ірына АСТАФ'ЕВА.** — Нават калі пакупнік захаваў чэк на пакупку, адстаяць свае правы вельмі складана. Цяпер ідэнтыфікацыйны нумар пачалі клеіць унутры халадзільніка. Да нас са скаргай звярнулася жанчына, якая па няведанні яго змыла, а халадзільнік аказаўся няякасным. У судзе прадстаўнікі гандлю абвінавацілі пакупніцу ў тым, што яна набыла ў іх магазіне добры тавар, а пасля падмяніла на другі такой жа маркі і мадэлі, але няякасны.

Інфармацыя пра тое, як можна падмануць пакупніка, хутка распаўсюджваецца. Па адных і тых жа схемах могуць працаваць як асобныя прадпрымальнікі, так і вялікія магазіны, што гандлююць тэхнічнымі таварамі. Пакупнік даверліва ставіць ва ўсіх дакументах подпісы і не падазрае, што такім чынам сабе шкодзіць. Пры ўзнікненні спрэчак з-за гэтых авансам атрыманых магазінам подпісаў ён нічога не зможа даказаць у судзе, бо, маўляў, сам пацвярджаў, што тавар яму перададзены якасны.

Часта пакупнік не адразу заўважае, што набыў дэфектную рэч. Як правіла, складаныя тэхнічныя тавары, такія як халадзільнікі, тэлевізары, газавыя пліты дастаўляюцца ў вячэрні час. Акрамя таго, людзі могуць набываць іх на падарункі і не распакоўваць.



Калі вас просяць распісацца ў гарантыйным талоне, дзе загадзя пастаўлены штамп і пячатка, што тавар прадэманстраваны і спажывец не мае прэтэнзій, распісвайцеся толькі з прыпіскай, што цалкам тавар прадэманстраваны не быў і вы не можаце пацвердзіць, што ён якасны.

Многія спажыўцы, нават і не ўяўляюць, што ўсё трэба кантраляваць, нават дастаўку тавару. Інакш вы рызыкуеце страціць грошы, бо часта такая тэхніка нават аднаўленню не падлягае.

— Можа, сёння, перш чым абвінавачваць спажыўца і падрываць свой аўтарытэт, гандлёвым прадпрыемствам неабходна больш уважліва сачыць за сваімі работнікамі? — заўважае Ірына Іванаўна — Чаму б не прымяняць сучасныя тэхналогіі і не наладзіць відэаназіранне за грузчыкамі? Крамы сябе засцераглі нават такім чынам, што прапісалі, што грузчыкі не маюць права распакоўваць тавар. Можа, ужо ёсць сэнс патрабаваць інструкцыі па распакоўцы ці адмаўляцца ад пакупкі, калі работнікі магазіна дастаўлены тавар не настрояць і не прадэманструюць у вас дома?

Калі вы набываеце тэхнічныя тавары і маеце падобныя праблемы, ці нават калі толькі плануеце зрабіць пакупку, тэлефануйце ў Мінскае таварыства спажыўцоў (гарачая лінія 226-72-90). Тут ствараецца база даных па зваротах спажыўцоў і можна даведацца, на якія магазіны і тавары паступалі скаргі.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Як сябе падстрахаваць, каб не застацца з новенькім, але нерабочым тэлевізарам ці халадзільнікам?

1. Калі ў магазіне прадаецца тэхнічны тавар, які вы збіраецеся купіць, неабходна паглядзець на ім серыйны нумар і сфатаграфаваць ці запісаць. Пры падпісанні гарантыйнага талона трэба зверыць, ці адпавядае пазначаны там серыйны нумар таму, які быў на прадэманстраваным тавары, бо паказаць вам могуць адно, а прывезці іншае.

2. Калі вас просяць распісацца ў гарантыйным талоне, дзе загадзя пастаўлены штамп і пячатка, што тавар прадэманстраваны і спажывец не мае прэтэнзій па якасці, распісвайцеся толькі з прыпіскай, што цалкам тавар прадэманстраваны не быў і вы не можаце пацвердзіць, што ён якасны. Тады, калі раптам узнікнуць праблемы з пакупкай, вы ў судзе зможаце адстаяць свае правы. Няправільна, што сёння спажыўцоў прымушаюць распісвацца ў гарантыйных талонах. Насамрэч даведацца, ці якасную рэч вы купілі, можна толькі падчас эксплуатацыі. Так, каб халадзільнік набраў холаду, неабходна некалькі гадзін. Як правіла, у магазінах няма ўмоў для правядзення поўнай дэманстрацыі тавару. З-за шуму не заўсёды можна праверыць якасць гуку ў тэлевізараў, радыё і іншых прыбораў.

3. Пасля таго, як тавар прадэманстраваны, прасіце, каб яго пры вас упакоўвалі, сачыце (асабліва гэта тычыцца вадкакрышталічных тэлевізараў), каб не ўдарылі. Пры магчымасці суправаджайце тавар у час дастаўкі. І зноў жа, калі распісваецеся за дастаўку, пазначайце, што не можаце пацвердзіць, што тавар якасны.

Уважаемые акционеры ЗАО «На Уманской»

31 марта 2016 года в 10.00
СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
ЗАО «НА УМАНСКОЙ»

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Об избрании председателя и секретаря Общего собрания.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета.
3. О внесении изменений в Устав общества.
4. Основные направления деятельности общества, итоги его работы, утверждение отчета деятельности общества.
5. Утверждение отчета и заключения Ревизионной комиссии, утверждение баланса общества, использования прибыли за 2015 год.
6. Утверждение размера окончательного дивиденда, приходящегося на 1 простую акцию по результатам работы за 2015 год.
7. О выплате промежуточных дивидендов по результатам работы за 2016 год.
8. Определение основных направлений деятельности общества на 2016 г.
9. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра **на 2 марта 2016 года.**
Время регистрации участников – в день проведения собрания с 09.30 до 10.00 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 55.
Регистрация акционеров проводится по паспорту.
Форма проведения общего собрания акционеров – очная.
Форма голосования по всем вопросам повестки дня – открытая.

УНП 101085067 *Наблюдательный совет*

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Лот № 1**. Автокран КС 45719-5А, гос. № АВ1799-2, г.в. 2007. Стоимость объекта – 339 043 264 рубля **Лот № 2**. Экскаватор-погрузчик NEW Holland LB 115, заводской № 00524963, №8GH15872, г.в. 2008. Стоимость объекта – 452 264 791 рубль **Лот № 3** Грузовой автомобиль ИВЕКО ДЕЙЛИ 50С15, г.в. 2007, гос. № АВ1026-2 Стоимость объекта – 11 886 056 рублей
Собственник (владелец) имущества	ДКУСП «Шарковщинская ПМК-68» (УНП 30033719)
Наличие обременений	отсутствуют
Местонахождение (адрес) имущества	Витебская область, г.п. Шарковщина, ул. Рабочая, 1
Место (адрес), дата и время проведения торгов	29.03.2016 в 14.30 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3
Справочная информация об организаторе торгов	Управление принудительного исполнения ГУЮ Витобликсполкома 210015, г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3 Судебный исполнитель Ходунькин Сергей Сергеевич, тел./факс: (80212) 614023, (8033) 6879136 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212) 614015
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витобликсполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, **не позднее 15.00 25.03.2016 г.** Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. Более подробную информацию можно получить на сайте Главного управления юстиции Витебского облисполкома www.vitebskjust.gov.by

Сямейная газета

Выпуск № 5 (48)

НАТХНЕННЕ НА ДАЛОНЬЦЫ

На мінулым тыдні калега адзначала юбілей. Усе мы былі ў шоку, калі даведаліся, што ёй — 50. Бо Ірына ну ніяк не выглядае на гэты ўзрост. Тое ж самае і з маёй блізкай сяброўкай. Яна мае двух дарослых сыноў, якія вось-вось падораць ёй унукаў. Гляджу на тую без года-двух бабулю і радуюся. І за яе, і за будучых унукаў. Вось бы і мне праз 10-15 гадоў застацца такой жа энергічнай, лёгкай на пад'ём жыццялюбкай з дзіцячай іскрынкай у вачах. Разам з тым ведаю нямала людзей, якім і ў 30 можна даць усе 50. Не, нават не па знешнім выглядзе. Па энергетыцы.

Нядаўна ехала ў тралейбусе, а насупраць — маці з дачушкай. Няўрымслівая дзяўчынка гадоў сямі ўвесь час прапаноўвала нейкія гульні. «Мама, а давай я на далоньцы тваёй буду маляваць? А ты будзеш адгадваць!». І, не дачакаўшыся адказу, пачынае вадзіць маленькім пальчыкам па матулінай далоньцы. «Што гэта?» Заклапочаная жанчына ў строгім паліто і на абцасах паціскае плячыма: «Яблык?». «Не, ты што, гэта ж натхненне! А гэта?» — паказвае на новы рукатворны «шэдэўр» малая. «Блін». «Які ж гэта блін, — смяецца дзяўчынка. — Я намалявала чараўніцтва». Маці і на наступныя пытанні кідала нейкія здагадкі «дзеля галачкі», пакуль раптам яе ўвагу не адцягнула... «Ой, Аліна, паглядзі, у цябе пляма на куртачцы!» — «Ну і што, не звяртай увагі», — бесклапотна адмахнулася дзяўчынка і працягнула «маляваць». Але маці было ўжо не да гульні, яна ўсю дарогу згадвала пра тую пляму...

Аднойчы два манахі падышлі да пераправы праз бурлівую раку. На беразе стаяла жанчына, якая баялася ўвайсці ў ваду, бо плынь магла папросту яе знесці. Яна папрасіла дапамагчы ёй пераправіцца. Малады манах зрабіў выгляд, што не пачуў, і прайшоў міма. Бо манаскі зарок найстражэйшым чынам забараняў не тое што датыкацца да жанчын, нават глядзець на іх. А пажылы спакойна падняў яе на рукі і перанёс праз раку. І яны пайшлі далей. Праз некалькі гадзін маладога манаха прарвала: «Брат, як ты мог парушыць наш зарок, дакрануцца да гэтай жанчыны?» Пажылы адказаў: «Як дзіўна, я яе перанёс і пакінуў на беразе. А ты нясеш дагэтуль...».

У кожным з нас жыве як мінімум два «Я»: «я–дзіця» і «я–дарослы». Добра, калі яны ладзяць між сабой. Але, як правіла, «я–дарослы» пакрысе, зусім незаўважна, прыціскае сваім аўтарытэтам слабейшага саперніка. Кажу так, бо сама пару гадоў таму сутыкнулася з падобнай праблемай. Сябар-псіхолаг заўважыў, як я пакутую ад таго, што «я–дарослая» наступае на пяткі майму «я–дзіцяці», і прыдумаў цудоўную методыку. Узяў белы аркуш, падзяліў на дзве часткі. У першай калонцы былі такія якасці, як лёгкасць, спантаннасць, непасрэднасць, творчасць, ранімасць, матэрыяльная залежнасць, наіўнасць... У другой — планаванне, мітусня, неспакой, аўтаматызм, сіла волі, логіка, незалежнасць... І прапанаваў выбраць з кожнай калонкі тыя якасці, якія мне імпануюць. Аб'яднаць «Надзею–дзіця» з «Надзеяй–дарослай». Пазнаёміць іх, памірыць! Гэтай паперкай карыстаюся дагэтуль... Дастаю яе з асабістага дзённіка, калі адчуваю, што растрачваю свой час, энергію на «хто што скажа», «што падумае», на зайздрасць, раздражненне, ныццё (а потым здзіўляюся, чаму яе — энергіі — ні на што больш не хапае? Адкуль з'яўляецца разбітасць, стомленасць?). І, ведаеце, дапамагае...

— Чаму я стаў старым? — запытаўся вучань 3 «Б» класа Пеця Зубаў з «Казкі пра страчаны час».

— Цябе ў яго ператварыў злы чараўнік, — адказала драўляная зязюля з насценнага гадзінніка.

— А чаму я гэтага не заўважыў?

— Чалавек, які марнуе час, не заўважае, як старэе...

Надзея ДРЫЛА.

■ Пераадоленне

ПАДЫМІСЯ НА ПРЫСТУПКУ — І ЎБАЧЫШ НАСТУПНУЮ

Сакрэт выратавання адносін ад Ганны Хітрык і Сяргея Рудзені

«Мы радуемся таму, на што звычайна сем'і не звяртаюць увагі. Учора, напрыклад, сын... нас падмануў. Гэта ж крута!..» З акцёрамі і музыкамі Ганнай ХІТРЫК і Сяргеем РУДЗЕНЕМ мы сустракаемся ў холе дзіцячай спартыўнай школы. На размову — усяго паўгадзіны, пакуль у іх Сцёпы занятак па акрабатыцы. У такім загружаным рэжыме сям'я жыве апошнія паўтара года, з таго моманту, як малому паставілі дыягназ «аўтызм». За гэты час многае змянілася, але бацькам удалося захаваць асноўнае — свае адносіны. Таму пакуль Сцёпа вучыцца рабіць «кола», шчаслівыя Аня і Сяргей расказваюць, як паспяваць усё і чаму нельга дзеля дзіцяці ахвяраваць сабой.

Фота Надзеі БУЖАН.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

■ Далучайцеся!

АДШУКВАЮЦЦА... МУЖЧЫНЫ,

ЗДОЛЬНЫЯ НАВУЧЫЦЬ АДКАЗНАСЦІ

Сацыяльны праект «Каманда мары» для выхаванцаў дамоў-інтэрнатаў Мінска афіцыйна стартаваў у канцы лютага. Аднак ужо са снежня мінулага года 40 падлеткаў 11-16-гадовага ўзросту займаюцца з трэнерамі «Дынама» і рыхтуюцца да таварыскага матчу па футболе сярод дзіцячых дамоў, што пройдзе ў маі. Прыйсці на трэніроўку і згуляць з хлопцамі можа кожны ахвотны, запісаўшыся на сайце www.dreamteam2016.by. Арганізатары хочуць знайсці для кожнага са 179 інтэрнатаўскіх хлопчыкаў ад 7 да 17 гадоў дарослага сябра-мужчыну. Гэтыя людзі мусяць стаць для дзяцей настаўнікамі, якія змогуць сустракацца з імі хоць бы раз на тыдзень, гутарыць, даваць парады, падтрымліваць.

Фота Надзеі БУЖАН.

Іван ГАРБАР, трэнер футбольнага клуба «Дынама Мінск» вучыць тонкасцям гульнявога майстэрства.

— Лёгка аднойчы прыехаць з падарункамі ў дзіцячы дом. Цяжэй прыязджаць да пэўнага дзіцяці рэгулярна, калі пачынаеш шчыра цікавіцца, як яно жыве, калі глыбей унікаеш у яго праблемы. І ўсё гэта задарма, — расказаў аўтар і натхняльнік ідэі праекта **Арцём ГАЛАВІЙ, дырэктар установы па сацыяльнай адаптацыі дзяцей-сірот «Ніткі сяброўства».** *— Я сам стаў круглым сіратой у 13 гадоў і на сабе адчуў, што значыць жыць без бацькоў. Зведаў гэтую праблему знутры. Разумею, што такія дзеці адчуваюць непрыняцце і адрынутасць, як ім непрыемна проста чуць, што яны сіроты. Набыць навыкі самастойнасці і адказнасці без прыкладу цяжка, таму важна, калі побач ёсць дарослы, здольны накіраваць, падказаць.*

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

■ Нататкі таткі

НАЙЛЕПШЫ ПАДАРУНАК

Учора нашай Васілісе споўнілася 2 гады. У гэты дзень, як і на большасць іншых свят, апроч цацак мы падарылі дачцэ кнігу. Праўда, не зусім звычайную: галоўная гераіня аздобленага малюнкамі і аддрукаванага адзінкавым тыражом выдання — Васіліса, другасныя персанажы — нашы родныя.

З кнігамі ў маёй сям'і сябруюць з дзяцінства. Памятаю, калі надвор'е не дазваляла гуляць на дварэ, мы бавілі час не ля старэнькага чорна-белага тэлевізара «Вясна», а з кнігамі. Дзве паліцы, застаўленыя рознымі выданнямі, былі перачытаны не адзін раз. Прызнаюся, што я нават любіў хварэць, бо ў гэты час можна было чытаць, не адрываючыся на хатнія клопаты. Бывала, тэкст так паглынаў, што ты з сумам заўважаў, што непрачытаных старонак застаецца ўсё менш і менш. У такіх выпадках знарок рабіў паўзы, каб «пасмакаваць» даўжэй. Кожны раз за чытаннем ты не проста бавіў час, ты будаваў свой унутраны свет. Кнігі вучылі думаць, бачыць больш, чым ёсць перад тваімі вачыма, вабілі наперад, давалі арыенціры ў жыцці. Менавіта таму мы з жонкай цвёрда вырашылі прывіваць любоў да чытання сваім дзецям.

Калі Віка была цяжарнай, я прывёз з дому адну са сваіх любімых прыгодніцкіх кніг. З першых дзён жыцця дачкі пачаў яе чытаць, але, не заўважыўшы асаблівай рэакцыі, адмовіўся ад гэтай ідэі. Да тэмы чытання мы вярнуліся літаральна праз месяцы два. Каб вырашыць некаторыя справы, нам на некалькі гадзін давялося пакінуць малую з маёй сястрой. Калі вярнуліся, засталі такую карціну: нянька сядзела ля ложачка і чытала, а Васіліса ўважліва слухала. Сястра патлумачыла, што толькі так змагла супакоіць малую. І мы зноў пачалі чытаць.

Першую кнігу Васілісе набылі, калі ёй не было 10 месяцаў. З таго моманту дачка стала сапраўднай аматаркай чытання. Раніцай, удзень, увечары яна заўсёды гатова бавіць час за кнігамі. Безумоўна, як усе дзеці, яна гуляе з цацкамі, любіць лётаць па кватэры і шукаць шкоду. Але, калі запытацца, што будзем рабіць, то яна імгненна адкажа: «Чытаць». Менавіта таму з усіх падарункаў дачка больш за ўсё радуецца кнігам. І, трэба сказаць, апошніх ужо назбіралася нямала. Васілісіна бібліятэка сёння налічвае больш за 50 выданняў, розных паводле фармата, зместу і колькасці старонак. Усе яны ўжо не адзін раз перачытаны. Часам нават здаецца, што дачка ведае іх на памяць. Прынамсі, пасля доўгага перапынку яна з лёгкасцю аднаўляе ў тэксце знарок прапушчаныя фразы, добра памятае герояў і іх прыгоды, нярэдка падчас размовы нават цытуе казкі. Калі ж надыходзіць час чытання і ты даеш ёй магчымасць самой выбраць кнігу, яна аж трымціць ад хвалявання, пераглядае вокладкі, агучвае назвы і са шчасцем у вачах прымае рашэнне.

Мы перакананы, што менавіта дзякуючы кнігам дачка пачала рана размаўляць і сёння без цяжкасцяў будуе сказы. Можа патлумачыць, што ёй неабходна, дзе была, што бачыла. Больш за тое, яна сама пацягнулася да вучобы. Васіліса ведае ўсе літары і ўжо спрабуе чытаць простыя словы. І ўсё гэта адбываецца без прымусу. Проста ёсць інтарэс, які мы развіваем. Дзеля гэтага не толькі набываюцца новыя кнігі. Мы намагаемся агарадзіць яе ад тэлевізара і камп'ютара, якія ніколі не ўключаем пры дачцэ. І хоць малая і ўмее сама ўключаць той жа тэлевізар, але цікавасці да яго не мае. Тут, на мой погляд, значная заслуга жонкі, якая ніколі не старалася заняць час Васілісы мульцікамі. Не буду спрачацца наконт карысці апошніх — мы проста аддалі перавагу кнігам.

Я пішу гэты тэкст і не ведаю, як Васіліса адрэагуе на наш падарунак, ці спадабаецца ёй кніжка пра сябе? Хутчэй за ўсё, яна ўважліва паслухае, мы перачытаем кнігу не адзін раз, а потым малая папросіць працяг гісторыі, які, магчыма, яна будзе чытаць ужо сама.

Аляксандр АЛЕСІК

■

АДШУКВАЮЦЦА... МУЖЧЫНЫ...

Пяць дзяцей — не лёгка, але і не суперцяжка

Стасункі настаўніка і дзіцяці могуць працягвацца ўсё жыццё, а могуць скончыцца задоўга да паўналецця выхаванца. Галоўнае — своечасова прызнацца сабе, што паміж людзьмі проста не знайшлося пунктаў судакранання. Аднак, як паказвае практыка кіеўскіх настаўнікаў-валанцёраў, калі адносіны добрыя, моцныя і глыбокія, яны захоўваюцца на ўсё жыццё.

Праграма настаўніцтва працуе ў свеце больш за 100 гадоў і цяпер рэалізуецца ў 13 краінах. Яе дзейнасць пачалася ў ЗША з дапамогі сем'ям, якія апынуліся ў крызісным становішчы.

— Некаторыя настаўнікі нават становяцца хроснымі бацькамі дзяцей сваіх выхаванцаў, — дадаў Арцём Галавій, успамінаючы пра свае дзіцячыя гады. *— Нас з братам выхоўвалі бабуля і дзядуля, аднак праз свой узрост яны не маглі рабіць тое ж, што маладыя бацькі. Літаральна ў дзень пахавання мамы да мяне падышла яе знаёмая і прапанавала звяртацца да яе, калі спатрэбіцца. У падлеткавым узросце паўстае шмат пытанняў, і хутка я пачаў прыходзіць у іх сям'ю па парады. Гэта адыграла адну з ключавых роляў у маім жыцці. Вера (з якой я маю стасункі і дагэтуль) пакарыла маё сэрца тым, што прыняла такім, якім я быў. Яна была заўсёды рада мяне бачыць, цікавілася, што са мной адбываецца. Адчувалася, што ёй было не ўсё роўна, а гэта так важна для сіраты.*

Арцём назіраў за стасункамі сваёй нечаканай настаўніцы з мужам і дзецьмі, часам нават заставаўся начаваць. Перад вачыма ён меў той прыклад практычнага вопыту сямейных адносін, якога пазбаўлены дзеці з інтэрната. Тады ж у падлетка з'явілася мара стварыць сям'ю на ўзор той, якую ён бачыў. Яму захацелася мець свой ачаг прыязнасці і любові.

Пасля з'яўлення на свет дзвюх дачок Арцём з жонкай, якую ён называе не іначай як сапраўднай памочніцай і сябрам, усынавілі 10-месячнага хлопчыка. Потым у сям'і нарадзіліся яшчэ адна дачка і сын.

Прыйсці на трэніроўку і згуляць з хлопцамі можа кожны ахвотны, запісаўшыся на сайце www.dreamteam2016.by.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Фота Надзеі БУЖАН.

Хлопцы аддаюцца гульні цалкам. На кожнай трэніроўцы гуляюць, быццам на матчы.

— З нашымі першымі кроўнымі дочкамі мы дамовіліся, што тата прывязе ім з дзіцячага дома браціка. І ад Цімафея таксама не будзем утойваць, адкуль ён з'явіўся, каб малы помніў сваю гісторыю, — расказаў Арцём. — Нашы дзеці ведаюць, што я часта езджу да іншых дзетак, ведаюць, хто такі сірата. І мы з жонкай нагадваем ім пра каштоўнасць таго, што ў іх ёсць бацькі. У сям'і яны ўсе браты і сёстры, ніхто не спаборнічае паміж сабой — яны ў адной камандзе.

З пяццю дзецьмі не лёгка, але і не суперцяжка. Увесь вольны час, якога катастрафічна не хапае, бацькі аддаюць дзецям. Часам малыя ездзяць разам з імі ў інтэрнаты.

Асаблівасць і нават існасць сям'і Галавій у тым, што дзецям бацькі прывіваюць хрысціянскую веру. Пры гэтым малыя нехрышчоныя — яны самі вызначацца з выбарам, калі падрастуць. Штовечар у сям'і чытаюць Біблію, моляцца ўсе разам. Праз малітвы дзеці вучацца дзякаваць Богу за тое, што яны жывыя, вучацца прасіць, каб у людзей, у чыім жыцці ёсць бяда, яе не было. Часам малыя нават самі прапануюць памаліцца за некага, у каго маюцца праблемы.

Спорт — мова, зразумелая ўсёй «моцнай палове»

Падлеткі трэніруюцца два разы на тыдзень ужо тры месяцы і паказваюць першыя вынікі. Спартыўныя здольнасці хлопцаў мы змаглі ацаніць на полі Футбольнага манежа падчас трэніроўкі. Іншымі зменамі стала лепшая вучоба і адмова ад курэння тых, хто пакаштаваў на смак дрэнную звычку. «Дыхалкі не хапала», — па сакрэце дзяліліся хлопцы. Хоць нагрузкі тут і не надта вялікія (бо першасная задача ўсё ж такі не стварэнне спартыўных зорак), аднак кожны з хлопчыкаў адчуў, што на полі больш паспяховыя тыя, хто сябруе са здаровым ладам жыцця.

«З нашымі першымі кроўнымі дочкамі мы дамовіліся, што тата прывязе ім з дзіцячага дома браціка».

— Спорт — міжнародная мова, зразумелая любому мужчыну. Мы спадзяёмся, што праз футбол яны зразумеюць сутнасць настаўніцтва і стануць валанцёрамі, якія будуць займацца з хлопцамі, знаходзіць для іх правільныя словы, паказваць свой станоўчы прыклад, — распавяла **Марыя ГВАРДЗЕЙЦАВА, дырэктар агенцтва PRCI. Storytellers,** аднаго з арганізатараў праекта. *— Калі мы зможам знайсці гэтым дзецям настаўніка, які здолее выправіць іх лёс, то гэта і сапраўды будзе «Каманда мары».*

Дадатковай пляцоўкай для пошуку мужчын-валанцёраў «Дынама» гатовае зрабіць усе свае сезонныя хатнія матчы на працягу 2016-га.

— Нашы футбольныя балельшчыкі — гэта ў асноўным дарослыя мужчыны, якія могуць стаць настаўнікамі, — адзначыў **Сяргей ВАРКАЛАЎ, камерцыйны дырэктар футбольнага клуба «Дынама Мінск».** *— Мы будзем вазіць дзяцей на трэніроўкі ў Стайкі. Гэтыя мерапрыемствы адкрытыя для ўсіх, хто гатовы ўдзельнічаць у праекце. Калі будзе такая магчымасць, прымем і дзяцей з інтэрнатаў іншых абласцей.*

У асноўным падлеткі будуць гуляць з дубліруючым складам клуба, але і з асноўнымі гульцамі таксама будуць сустракацца. Плануецца, што за два з паловай месяцы хлопцы згуляюць з рознымі дарослымі камандамі: пажарнымі, ваеннымі... Арганізатары спадзяюцца таксама, што знойдуцца людзі, гатовыя запрасіць юных футбалістаў на экскурсію да сябе на працу, каб яны змаглі на практыцы ўбачыць, што ўяўляе тая ці іншая прафесія.

Дарэчы, калі знойдуцца сродкі, каманда пераможцаў прыме ўдзел ва ўсерасійскіх спаборніцтвах па футболе сярод каманд дзіцячых дамоў і школ-інтэрнатаў «Будучыня залежыць ад цябе», што адбудзецца ў Сочы.

Ірына СІДАРОК.
sidarok@zviazda.by

Фота з архіва Арцёма ГАЛАВІЯ.

Мара Арцёма пра стварэнне сямейнага ачага прыязнасці і любові здзейснілася.

У Беларусі больш за 28 700 сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскага клопату. З іх 15,2% выхоўваюцца ў інтэрнатных установах. Хлопчыкаў-падлеткаў, якіх усынаўляюць пасля 10 гадоў, на жаль, не так шмат.

■ Сямейная кухня

НЕ ПАЧЫНАЙЦЕ З НЕДАВЕРУ

2 ВОСТРЫ ВУГАЛ 11 лютага 2016 г. Сямейная газета

■ Прыватнае жыццё

ШЛЮБ — ГЭТА САМААБМЕЖАВАННЕ І АБАВЯЗКІ

І няважна, зарэгістраваны ён ці не

Закахаліся — ажаніліся — з'ехаліся. Так мусіць выглядаць традыцыйная схема адносін. Прынамсі, такі варыянт выклікае менш пытанняў у навакольных і быццам бы гарантуе пары шчаслівае сумеснае жыццё. Стасункі ж тых, хто выбірае грамадзянскі шлюб, ставяць пад сумненне. Асабліва любяць папужаць жанчын: калі што, застанешся ні з чым! Гэта ў тэорыі, якую прапануюць нам форумы і сваякі. А на самай справе? Пра адказнасць у грамадзянскім шлюбе, веру ў сілу пячаткі ЗАГСа і каханне, мацнейшае за побыт, мы пагаварылі з сямейным псіхолагам Паўлам ЗЫГМАНТОВІЧАМ.

— Сітуацыя, калі пара з'язджаецца, але не афармляе свае адносіны афіцыйна, звычайна больш апасенняў выклікае ў бацькоў. Яны думаюць, што гэта ўсё несур'ёзна.

— Любое сумеснае пражыванне з вядзеннем агульнай гаспадаркі (калі ў людзей адзін [illegible] менш агульны бюд- [illegible] гадна толькі мужчыне. Бо ён атрымлівае і палюбоўніцу, і хатнюю прыслужніцу адначасова.

— А ці праўда, што, калі ён з вамі ажэніцца, сітуацыя зменіцца радыкальна? Жанчына звычайна думае: калі штосьці здарыцца, ён мяне кіне. І вызначае для сябе [illegible] афіцыйны [illegible] парце). Гэта паказчык статусу. Навошта напружваць сябе і тую жанчыну, з якой жывеш, перспектывай разысціся? Пачаўшы жыць з іншым чалавекам, мы абавязаны неяк увязваць свае паводзіны з ім. У інтэрнаце чалавек жа не будзе слухаць гучную музыку ў тры гадзіны ночы? Людзі, калі ў шлюб уступаюць, часта [illegible]

Штамп у пашпарце падобны да магічнага рытуалу. Але няма чароўнай магіі. Ёсць праца, высілкі, розум. Людзі хочуць нейкіх гарантый, што ўсё будзе добра. [illegible] тый няма.

Тэму, якую мы сёння будзем абмяркоўваць на «кухні», падказалі самі чытачы. Пасля выхаду ў «Сямейнай газеце» за 11 лютага інтэрв'ю з псіхолагам Паўлам Зыгмантовічам «Шлюб — гэта самаабмежаванне і абавязкі...» на адрас рэдакцыі літаральна пасыпаліся лісты і званкі.

Так, патэлефанавала маладая дзяўчына. Расказала, як ёй да вяселля многія сябры раілі не спяшацца ісці ў ЗАГС. Маўляў, паспееш яшчэ, пажыві з ім хоць паўгода, разам здыміце кватэру. А раптам вы ў побыце не сумяшчальныя? *«Я спачатку паддалася ўплыву і прапанавала свайму хлопцу пажыць разам. Але ён адмовіўся наадрэз. Спаслаўся на свой мінулы досвед. Сказаў, што нічога з гэтага добрага не атрымаецца. І толькі цяпер, пасля таго, як мы пражылі разам у афіцыйным шлюбе год, я яго зразумела. І вельмі рада, што прыслухалася тады. Бо падобныя «праверкі» — гэта ўжо недавер. А пачынаць сумеснае жыццё з недаверу няправільна... У побыце, сапраўды, хапае ўсялякіх момантаў, але, калі ты кахаеш чалавека і хочаш быць з ім, то яны не змогуць разбурыць адносіны».*

«Выратавальнае святло хрысціянскай маралі»

«Хапіла ж нам і сталінскіх рэпрэсій, і Чарнобыля. А цяпер вось захліснула хваля п'янства, наркаманіі, жорсткасці бацькоў да дзяцей і дзяцей да бацькоў. Коціцца, не жадаючы спыняцца, хваля самагубстваў. І калі ўсе пералічаныя жахі мы сапраўды бяром блізка да сэрца, то на страшнае парушэнне Божай запаведзі «Не пралюбадзейнічай» чамусьці ўжо — о жах! — амаль не звяртаем увагі, — піша наша **пастаянная чытачка Галіна Эдуардаўна ТАЎЛУЙ, выкладчыца беларускай мовы і літаратуры Навагрудскага дзяржаўнага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя.** — *Возьмем, напрыклад, святое слова «шлюб». Давайце ўсё-такі, захоўваючы хоць проста лагічнае мысленне, прызнаем, што на самай справе ёсць толькі два віды шлюбу: грамадзянскі, калі мужчына і жанчына рэгіструюць свой законны саюз у ЗАГСе, і царкоўны, калі яны вянчаюцца ў царкве ці касцёле. І як жа апаганьваецца гэтае светлае слова «шлюб», калі ім называюць проста сужыццё мужчыны і жанчыны. Які «грамадзянскі шлюб», калі гэта толькі грахоўнае суіснаванне дваіх палавых партнёраў?! Адракаюцца свядома мужчына і жанчына ад духоўнасці, ад хрысціянскай маралі — зло імкнецца насустрач. А потым ужо ўсім грамадствам, але з болем, з адчаем пажынаем д'ябальскія плады: сем'і распадаюцца, як ніколі (а як ім не распадацца, калі не захоўваецца чысціня, цнатлівасць дзяўчат і хлопцаў да грамадзянскага або царкоўнага шлюбу, калі прапагандуецца як мага большая колькасць любоўных уцех?); у сем'ях, якія быццам захоўваюцца, пастаянныя канфлікты праз здрады мужа ці жонкі (а як не быць такім здрадам, калі, праэксперыментаваўшы з некалькімі палавымі партнёрамі, усё-такі па збегу абставін зарэгістравалі свой саюз у ЗАГСе).*

Разбураюцца сем'і — пакутуюць дзеці, якія ўваходзяць у жыццё зраненымі духоўна і ў сэрцах якіх збіраюцца боль, страх, злосць, адчай. Не было ў сям'і месца для маралі, духоўнасці — не будзе святла, любові, надзеі, веры ў дзіцячых душах. Зло ж асабліва моцна бярэ ў абдымкі такіх дзяцей: наце вам для суцяшэння алкаголь, наркотыкі, самагубства.

Але, дзякуй Богу, наша моладзь спрабуе ісці на выратавальнае святло Божых запаведзяў, вучыцца адрозніваць, дзе сапраўды зло, а дзе дабро. Цешуся, калі бачу, што юнакі і дзяўчаты з задавальненнем наведваюць духоўна-маральны клуб «Промні надзеі» (ён створаны пры ліцэі, у якім я працую 33 гады). Яго дзейнасць накіравана на асэнсаванне традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, хрысціянскай маралі».

Памятайце: выбірае жанчына. Калі яна не выбірае, то за яе гэта робіць грамадства, маці, глянцавыя часопісы, ТБ альбо побач аказваецца «не той мужчына»...

«Часам гэта надакучвае, але інакш — бардак»

«Так, сёння шмат шлюбаў распадаецца (пішаце, што 50%), але наконт сужыцця — распадаюцца ўсе сто працэнтаў, — разважае **Рамуальд са Слоніма.** — *Калі робіш жанчыне прапанову пажаніцца, і яна згаджаецца, гэта значыць, што яна гатова да сур'ёзных адносін і хоча мець ад цябе дзяцей. А калі яна кажа: «Навошта гэтыя фармальнасці? Нам добра і без штампа ў пашпарце», гэта значыць (на 90%), што ты для яе — часовы варыянт, ці ў яе ёсць яшчэ нехта. Вядома, Рамэа і Джульету Шэкспір з дапамогай свайго таленту пазбавіў ад усялякіх роспісаў, але ў нашым рэальным жыцці адносіны дарослых людзей (не толькі шлюбныя, але і дзелавыя і г.д.) рэгулююцца подпісамі і штампамі. Вядома, часам гэта надакучвае, але інакш — бардак.*

Мы не анёлы, можна жыць без усялякага афармлення адносін, можна мець «выпадковыя сувязі», але падтрымліваць гэтую справу як прыкмету сучаснасці і «прасунутасці» не варта.

Разам з тым не падтрымліваю погляд, што «да вяселля — ні-ні». Трэба праверыць сумяшчальнасць наконт сексу (як казаў Зігмунд Фрэйд, «лібіда вызначае быццё»)».

Адносіны — гэта не гандаль

«Я абедзвюма рукамі за шлюб, — піша **Вікенцій з Віцебска.** — *Для мяне гэта вельмі сур'ёзны, лёсавызначальны выбар, праява даверу, узаемная згода ісці разам па жыцці, дзяліць гора і радасць, дапамагаць, узбагачаць адно аднаго. Разам з тым шлюб для мяне — гэта сапраўдная рамантыка, вандроўка з непрадказальнымі прыгодамі, а не ружовыя бурбалкі ілюзій.*

Мужчыну насамрэч не так шмат патрэбна: натхненне, адчуванне, што яго кахаюць (гэта і ёсць сапраўдная безумоўная падтрымка), і павага да ўнутранай свабоды. Пачнем з першага — тут маецца на ўвазе менавіта натхненне ад жанчыны. Яно акрыляе, дае энергію на здзяйсненне маштабных планаў (у тым ліку і агульных), самых светлых мар і, вядома, на ажыццяўленне жаданняў жанчыны. А ў сучасным свеце, які стаў надта карыслівым, эгацэнтрычным (і ад гэтага і пакутуе душа чалавека), усё дагары нагамі. Жанчыну прывучаюць думаць так: «Няхай ён спачатку пакажа, што можа здзейсніць усё, што я хачу, а я пагляджу». Але ж чалавек — не мэбля, не пральная машына. Чалавек — гэта мэта, а не сродак. І калі забыцца на гэта, тады ўсё жыццё незаўважна можа мінуць у гонцы за міфічным шчасцем. ...Між тым, як аказалася, я і сам магу натхняць сваю жонку...

Але натхненне — гэта першы крок. Падтрымка ад каханае жанчыны — гэта найвышэйшая ўзнагарода для мяне. Менавіта ўнутраная падтрымка, разуменне, душэўная цеплыня, а не «Спачатку няхай дасць мне нешта, а потым, можа быць, і я...» Хто і дзеля чаго захоча мець такія адносіны? Ці будуць яны здаровыя? Людзі прызвычаіліся найперш браць, а не даваць. Усе патрабуюць гарантый, і гэта нагадвае гандаль. Але ж, думаю, жаночае шчасце ў тым, каб кахаць. Тут некаторыя жанчыны могуць закрычаць: «А чаму гэта я павінна кахаць? Няхай мяне кахаюць!» Не, не павінна, як і мужчына нічога не павінен. Але шчаслівая тая жанчына, якая сапраўды кахае, бо навокал яе ўсё квітнее... І такі душэўны стан не купіш. Памятайце: выбірае жанчына. Калі яна не выбірае, то за яе гэта робіць грамадства, маці, глянцавыя часопісы, ТБ, альбо побач аказваецца «не той мужчына»...

А цяпер, бадай, самае складанае. Жанчына і мужчына разумеюць паняцце «свабода» палярна супрацьлегла. У жанчыны яно выклікае страх, асацыяцыю з хаджэннем «налева», з нядбайным стаўленнем мужа да сваіх абавязкаў. Для мяне ж свабода — гэта зусім іншае. Гэта калі абое цэняць свабодны свядомы выбар быць разам. Паважаюць адно аднаго, стараюцца прыслухоўвацца да ўнутранага стану свайго абранніка. Гэта калі абое — дарослыя людзі, а не капрызныя спажыўцы, якія грызуць адно аднога, мэта якіх — не сам чалавек, а хібная карысць, якую ён атрымае ад шлюбу.

Цяжка даць формулу шчасця. Сэнс залягае глыбей — варта прыслухацца да сябе...»

Падрыхтавала Надзея ДРЫЛА.
dryla@zviazda.by

■

■ Вазьму твой боль...

Ці перавяліся добрыя людзі?

Дабрачынны рух «Клуб 5000» дапамагае сем'ям анкахворых дзяцей у самыя складаныя хвіліны. Мы прыходзім на дапамогу тым, чыё жыццё і без цяжкага дыягназу не фантануе радасцю. Мы падтрымліваем сем'і, якім не пад сілу вырашыць нават дробныя бытавыя пытанні, не кажучы пра небяспечную хваробу дзіцяці. І менавіта такія сем'і часта застаюцца няўдзячнымі.

ВАЛЯНЦІНА, маці шасцярых дзяцей, калісьці магла быць прыгожай жанчынай. Але муж-алкаголік, вечная галеча і клопаты не пакінулі шанцу. Маладосць засталася толькі ў пашпарце — на выгляд ёй дасі гадоў на дзесяць больш. Яна недаверліва глядзіць на дзвюх незнаёмых дзяўчат, якія задаюць асцярожныя пытанні і абяцаюць дапамагчы.

У нашу наступную сустрэчу на яе твары чыталася разгубленасць. Па ўсім відаць, што яна не верыла, што другое спатканне магчыма. Мы пакінулі дзве непад'ёмныя сумкі з адзеннем на ўсю вялікую сям'ю, пакет з прадуктамі. Дасталі з каробкі мабільны тэлефон, навучылі ім карыстацца. На развітанне — толькі разгубленасць. Ні слова, ні жэсту, ні эмоцыі. Толькі разгубленасць.

Трэцяя сустрэча — выклік. Яна так жа моўчкі прымала падарункі, не адрываючы вачэй ад экрана тэлевізара і працягваючы лузаць семкі. Мы паставілі пакеты каля ложка, запыталіся пра стан хворага сына і, не дачакаўшыся адказу, пакінулі палату.

Пазней Валянціна прызналася, што ёй ніхто ніколі ні ў чым не дапамагаў. Яна не ўяўляла, што такое магчыма. Яна трапіла ў новую рэальнасць і не ведала, як сябе паводзіць. Дапамога незнаёмых людзей шакіравала Валянціну нават больш за дыягназ сына. Яна не верыла, што бескарыслівая дабрыня існуе.

Я часта чую выразы, што ў наш час перавяліся добрыя людзі. Маўляў, з жывёламі куды прасцей і бяспечней строіць адносіны, чым з людзьмі. У доказ назіраю гісторыі вернасці, любові і клопату свойскіх (ды і дзікіх таксама) гадаванцаў і іх двухногіх сяброў. Але я перакананая, што нас акаляюць тыя ўмовы, тыя людзі і тыя здарэнні, якіх мы самі прыцягваем. Варта проста заўважаць маленькія прыклады дабрыні і рабіць іх самому. А далей снежны ком зробіць сваю справу.

Мой знаёмы, усё жыццё пражыўшы ў Маскве, у 72 гады пераехаў у беларускую сталіцу. Ён трапіў у іншую рэальнасць. Сталы чалавек ніколі не мог сабе ўявіць, што людзі могуць прытрымліваць дзверы ў метро. Ён убачыў элементарны клопат пра бліжняга. У яго адкрылася другое дыханне, з'явілася жаданне жыць.

Я заказваю навагодніх фетравых анёлкаў у замежнай краме па інтэрнэце. Яны прыходзяць у час, але не таго колеру: блакітныя замест жоўтых. Паведамляю прадаўцу пра сваё расчараванне. Ён прапануе вярнуць грошы, каб пазбегнуць канфлікту. Я вырашаю пакінуць грошы прадаўцу, але ў якасці кампенсацыі прапаную ўсё ж такі даслаць мне жоўтых анёлкаў. Не асабліва разлічваю на добрасумленнасць. Такія крамы — знаходка для махляроў. Мы часта не атрымліваем пасылкі з аплачаным таварам. Бывае, што прадавец выдаляе старонку пасля некалькіх здзелак — і ніякіх гарантый і зваротаў. Таму я, прызнацца, і не чакала другую партыю анёлаў.

Новы год мы цудоўна адсвяткавалі з блакітнымі крылатымі ахоўнікамі. Святы прайшлі — ёлку прыбралі, упрыгожанні клапатліва склалі ў каробку да наступнага снежня. І тут пасылка. З жоўтымі анёламі. Мы нават водгук чалавеку пакінуць ужо не можам, бо здзелка даўно закрыта. Ды і паскардзіцца на яго не маглі б — першых анёлаў мы ж таксама атрымалі. Ён ведаў пра гэта. Але даслаў новых, цяпер сапраўды жоўтых, анёлаў. Не дзеля водгуку, не праз боязь скаргі. Проста так. Бясплатна. Таму што я хацела менавіта жоўтых.

А яшчэ я з радасцю назіраю за музыкамі ў пераходзе. Дакладней, за іх слухачамі. Кладуць жа грошыкі ў шапку. У эканоміцы крызіс, на працы скарачэнні, зарплату затрымліваюць, на радасці не хапае... А людзі слухаюць музыку, расчульваюцца і даюць за яе грошы. Хоць могуць не даваць. Гэта ж не смяротна хвораму дзіцяці дапамагчы, дзе твой удзел грэе і ўласная годнасць узнімаецца на два пралёты. Гэта просты вулічны музыка, якога можна паслухаць употай, з-за рага, ці аблаяць, ці хутка прабегчы міма. А яму кладуць грошы.

Заўважаючы гэтыя дробязі, мы фарміруем вакол сябе кола і прыцягваем у яго маленькія і больш значныя выпадкі, фігуры, учынкі і людзей, якія не перавяліся.

Таццяна НЕМЧАНІНАВА, заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»

■

ПАДЫМІСЯ НА ПРЫСТУПКУ — І ЎБАЧЫШ НАСТУПНУЮ

«Не трэба шукаць вінаватага»

— Што сям'я адчувае, калі даведваецца, што іх дзіця — з асаблівасцямі?

Сяргей: Крыўду, таму што не разумееш, за што гэта мне. Страх, бо не ведаеш, што рабіць з гэтым. І ўрачы нічога не могуць параіць.

Аня: Мы паплакалі, пачулі «цудоўныя» словы кшталту «Трымайцеся, бацькі»...

Сяргей: «Нараджайце здаровенькага»...

Аня: Гэта кажуць абсалютна ўсім мамам. Першае пытанне пасля слёз было: што рабіць? Мы ведаем: калі баліць галава, трэба выпіць цытрамон. Баліць страўнік — глытаеш зонд, і прызначаюць лячэнне. Мы думалі, і ў нас так. «Пап'яце рысперыдон», — казалі ўрачы. Хто не ведае, гэта седатыўны прэпарат, які прытупляе свядомасць. Яго выпісваюць толькі дзецям, якія праяўляюць моцную агрэсію. У нас яго прызначаюць адразу, пасля 15 хвілін размовы з малым. І ты, натуральна, думаеш, што гэта як цытрамон. Проста даеш выпісаную дозу дзіцяці і чакаеш, што зараз, напэўна, штосьці адбудзецца. Ну, не сёння, дык праз тыдзень. Потым пытаешся: калі пераставаць прэпарат піць? А табе кажуць, што гэта назаўсёды. І тады, апроч крыўдаў, у цябе наступае момант нязгоды. Ты не хочаш гадаваць нейкую істоту, абсалютна не ведаючы яе. А многія ж бацькі не задаюцца гэтымі пытаннямі. І, шчыра кажучы, так прасцей.

— А калі шукаеш адказы на свае пытанні?

Аня: Уводзіш у інтэрнэце «Мінск, аўтызм», і табе нічога не выдаецца, акрамя слоў бацькоў, якія б'юцца галавой аб сцяну, як і ты. Знаходзіш такіх жа людзей, што дайшлі да адчаю. Мы сталі ва ўсе чэргі, якія нам параілі нашы службы. На курс карэкцыі ў Каменнай Горцы, у Цэнтр дапамогі аўтычным дзецям, дзе я цяпер працую. На курсе карэкцыі пачула, што трапім туды праз паўгода ў лепшым выпадку. А час ідзе, усё змяняецца — толькі ў горшы бок. Мы вельмі чакалі чагосьці, што палепшыць жыццё нашаму дзіцяці. Дачакаліся. Аказалася, што гэта два групавыя заняткі на тыдзень. Для мяне гэта сумніўная карэкцыя: ёсць вельмі шмат варыянтаў аўтызму. Я разумею, што хочуць, як лепш, але гэта не дапамога.

— Чаму бацькі ў такой сітуацыі звычайна не вытрымліваюць? У нас, на жаль, многія мамы, нарадзіўшы дзіця з інваліднасцю, застаюцца адны.

Аня: Бацькі пачынаюць шукаць вінаватага. І разыходзяцца праз гэта. Ім сапраўды так лягчэй. Маме, вядома, канец потым, бо яна адна, але ўсё роўна ў яе ёсць былы муж, які «вінаваты». Некаторыя сем'і застаюцца разам, але абвінавачваюць дзіця. «Ён здзекуецца з нас, усё ён разумее!»

Сяргей: Мы сварыліся страшна, разыходзіліся...

Аня: Потым трапілі ў спецыялізаваны цэнтр у Ізраілі, і нам паставілі мозг на месца. Але не кожны можа паехаць туды. І мы не змаглі б, калі б не аказалася, што ў нас столькі сяброў. У нас на той момант у скарбонцы ляжала долараў 600, а патрэбна было 16 тысяч.

Кожны вечар, калі ўкладваем Сцёпу спаць, мы, у якім бы стане ні былі, ідзём на кухню, каб пабыць разам, паразмаўляць.

У сусветнай практыцы, як толькі даведваюцца, што ў сям'і дзіця з асаблівасцямі, то ў першую чаргу падтрымка аказваецца бацькам. Бо толькі яны могуць дапамагчы свайму малому. Ніводзін цэнтр не займаецца з тваім дзіцем больш, чым ты з ім жывеш. І вось вам тлумачаць, што ніхто не вінаваты. І гатовы падтрымліваць першы час, пакуль вы не навучыцеся любіць сваё дзіця. Трэба «пахаваць» таго малога, якога вы сабе раней прыдумалі, адпусціць бацькоўскую мару. Гэта складаны перыяд, калі людзям патрэбна, каб з імі працавалі спецыялісты, а не яны да гэтага прыходзілі праз год, калі ўжо самі сталі крыху інвалідамі. Бо ўсё адкладаецца і працуе супраць твайго здароўя. І як мы адыходзілі ад гэтага, лепш не ўспамінаць, калі шчыра.

— На што яшчэ адкрылі вочы замежныя спецыялісты?

Сяргей: Паказалі, што Сцёпа — звычайнае дзіця. Проста крыху па-іншаму з ім трэба займацца. І ўсё. Гэта не іншапланецянін.

Аня: Яны звярталі нашу ўвагу на добрае. «Савецкая школа», з якой мы ўсе выйшлі, у дачыненні да любога дзіцяці з'яўляецца сістэмай пакарання. Калі малы зрабіў нешта не так, мы не кажам: «Ну нічога», а цэлы дзень будзем яго папракаць. Мы любім паказваць на іншага: «А вось Вася ўжо чытае па складах, а ты нічога не ўмееш». Замест таго, каб са станоўчай методыкай працаваць, радавацца: «Ты ведаеш літары! Ты навучышся». Нам паказалі, што, аказваецца, можна так. Мы гэты падыход і на свае адносіны з Сярожам перанеслі. Смяёмся, што ўжо крычым «Малайчына!» адно аднаму. Гэта ратуе нашы адносіны.

«Нам без творчасці ніяк»

— Хто займаецца выхаваннем Сцёпы?

Сяргей і Аня: Мы абое.

— І як удаецца размеркаваць абавязкі? Звычайна ж клопаты пра асаблівае дзіця цалкам на маці, а бацька — здабытчык.

Аня: Значыць, так зручна тату і з гэтым змірылася мама. Мы расставілі прыярытэты так, каб было выгадна крыху мне, крыху Сярожу і крыху больш за нас Сцёпу. Я менш працую ў тэатры, хоць амбіцыі былі. Але сыну добра, што мама ўвечары дома. Тата зразумеў, што паспаць можна, пакуль у Сцёпы трэніроўка. Паўгадзіны, дробнымі «адключкамі» *(смяецца)*. Калі ты разумееш, дзеля чаго, то ты проста будзеш працаваць і не будзеш думаць пра сябе.

— Пры ўсёй загружанасці, на што заўсёды сям'і варта знаходзіць час?

Сяргей: Каб тата і мама ўдваіх маглі пабыць, без дзіцяці. У кіно, кавярню выбрацца, паехаць кудысьці. Мы вось ездзілі ў Вільнюс, літаральна на дзень — ужо перазагрузка.

Аня: А яшчэ вельмі важна пакінуць час на сваё асабістае. Сышоўшы на 80 працэнтаў з тэатра, я не кінула музыку. Сярожа таксама, пасля таго як развязе нас, едзе пайграць на барабанах у студыі. Гэта тое, што нас грэе. У красавіку, напрыклад, у нашай групы Sounduk выходзіць новы альбом. Я вельмі гэтага чакаю. Сядзім з дызайнерам у студыі, рыхтуемся. Мы ўжо два гады працуем над гэтым альбомам.

Сяргей: Мы са сваёй групай «Дзявяты міліметр» запісалі другі дыск, будзем прэзентаваць яго ўвосень. У тэатры новая роля...

Аня: Мікалай Мікалаевіч Пінігін ставіць спектакль «Дзве душы». Сярожа не любіць пра сябе расказваць, але ён *(Аня пераходзіць на шэпт)* добры артыст, скажу вам па сакрэце... Не, без творчасці зусім ніяк. Ніяк.

— Аня, аднойчы вы казалі, што няправільна было б цалкам сысці з тэатра, закінуць групу і займацца толькі сынам (хоць многія бацькі выбіраюць менавіта такі варыянт). Чаму?

Аня: Вельмі простае тлумачэнне. Лічу, што гэта датычыцца ўсіх, бо, калі мы даводзім дзіця да ступені, пра якую марым (у нашым выпадку гэта — норма, і ўжо відавочна, што яна будзе), прыходзіць час яго адпусціць. А ты не хочаш, бо аддала ўсю сябе і чакаеш таго ж у адказ. Але дзіцяці павінна стаць з табой нецікава, таму што яно вырастае. Яно хоча пайсці гуляць з хлопцамі, закаціць вочы, калі ты імкнешся яго пацалаваць, бо нікога з яго аднагодкаў ужо не цалуюць. І ў такія моманты ты павінна нечым заняцца. Бо ў іншым выпадку пачнецца: «Я начэй не спала, а ты!..»

Сяргей: Будзеш вінаваціць дзіця. Дрэнна, што ў нас пра гэта ніхто не расказвае. Такія простыя рэчы адразу павінны тлумачыць у паліклініцы, як толькі ставіцца дыягназ.

— А як дыягназ Сцёпы змяніў ваша жыццё?

Аня: Мы вось радуемся, што наша дзіця нас учора падманула і паспрабавала спіхнуць віну на ката. Сцёпа адарваў кавалак старонкі ў кнізе, і калі я спытала, хто гэта зрабіў, ён літаральна праз пару секундаў выдаў: «Гэта, напэўна, Кеша, у яго ж кіпцюры». Для нас гэта вялікае шчасце, калі дзіця паводзіць сябе, як звычайнае: хлусіць, разумее гумар, глядзіць табе ў вочы пры размове. Калі ён бачыць, што машына няправільна прыпаркаваная, і кажа: «Дурны дзядзька! Тут нельга стаяць!» Значыць, ён зразумеў правілы. У нас усё складаецца з такіх момантаў.

Сяргей: Калі мы бываем у гасцях і назіраем за чужымі дзецьмі, мы радуемся за іх і не разумеем, чаму іх бацькі — не.

Аня: Гэта сітуацыя навучыла нас на ўсё глядзець зусім па-іншаму. Сапраўды, часам хочацца падысці да той ці іншай мамы і асабліва таты і страсянуць: «Ты што, не бачыш, што дзіця хоча радасцю падзяліцца, а ты сядзіш у сваім тэлефоне?!» Калі жылі ў Ізраілі, былі ў шоку ад адносін бацькоў з дзецьмі. Таты, калі гуляюць з малымі, качаюцца на зямлі, не баяцца быць смешнымі. У цябе ажно слёзы на вачах, калі бачыш гэта.

Я фанатка любых дзяцей. Яны вартыя таго, каб мы на іх звярталі ўвагу. А распешчаныя, злыя — гэта ўсё толькі ад бацькоў. Сярожа аднойчы сказаў геніяльную фразу: «Я ніколі не быў бы добрым бацькам, калі б гэтага не здарылася».

«Мы цяпер звычайная сям'я»

— Раскажыце пра сваю сям'ю сёння. Як выглядае ваш шчаслівы дзень?

Аня: Учора быў класны дзень. Мы з Сярожам узялі адпачынак за свой кошт, даўно дамовіліся. Прачнуліся, паваляліся са Сцёпам у ложку і паехалі ў аквапарк. Малы быў проста шчаслівы — вельмі любіць ваду. Потым — на музычную студыю, сын іграў на барабанах разам з татам. І гэта быў такі цудоўны дзень... Іх бывае, можа, пяць на год, але тым яны каштоўнейшыя.

А так у нас на халадзільніку вісіць вялікі расклад, прысвечаны Сцёпу, таму што сапраўды часам «дах зносіць». Сярожа развозіць нас: сына ў сад (ён ходзіць у інтэграваную групу), мяне ў цэнтр. Сам едзе на рэпетыцыю ў тэатр, потым збягае, забірае малога. Сцёпа два разы на тыдзень ходзіць да дэфектолага, тры разы на акрабатыку, адзін раз да псіхолага і ў Цэнтр дапамогі аўтычным дзецям, у суботу ў яго імітацыя школы ў дзіцячым цэнтры.

Сяргей: У басейн яшчэ запішамся.

— І як вы на гэта ўсё знаходзіце час?

Аня: Вось я і кажу: вісіць графік. Калі б не ён... Мы рэальна часам не разумеем, куды едзем. Але дамаўляемся, каб у кожнага быў адпачынак. Сярожа, напрыклад, на гэтым тыдні ідзе з сябрамі папіць піва. Я таксама што-небудзь потым папрашу. Пакуль не прыдумала, калі вазьму адгул у мужа *(усміхаецца)*. Кожны вечар, калі ўкладваем Сцёпу спаць, мы, у якім бы стане ні былі, ідзем на кухню, каб пабыць разам, паразмаўляць.

— А калі цяжка? Што дапамагае перажыць гэтыя моманты?

Аня: Смачная ежа.

Сяргей: Выбіраем добры фільм...

Аня: ...і ладзім пачастунак. Сярожа вельмі любіць бабку бульбяную. У мяне, вядома, на яе няма часу, але гатую. Муж можа зрабіць нам сушы.

Я нядаўна, відаць, перапрацавала моцна, і злягла з хваробай. Прачытала дзіцячую кніжку, сваю любімую Кэйт ДыКаміла — «Флора і Адысей». Гэта было такое шчасце! Суперадпачынак.

— Сцэна дапамагае разгрузіцца?

Сяргей: Вядома. Нават даехаць на машыне да працы, паслухаць музыку — ужо класна.

Аня: Я раней, калі ў тэатры бясконца іграла, думала: у мяне такі складаны графік, я так стамляюся моцна. Пфф... Халява! А вось праца з дзецьмі ў цэнтры... Калі хтосьці адчуе сябе пакутнікам, прыйдзіце ў наш цэнтр на любы занятак. Зразумееце, што вы абсалютна шчаслівы чалавек.

— Пра што марыце?

Аня: Я хачу другое дзіця.

Сяргей: А я машыну, каб не ламалася *(смяецца)*.

Аня: Сярожа жартуе пра новую машыну. Мы насамрэч збіраем мне на вучобу. Я езджу на платныя курсы, каб ведаць, як працаваць са сваім сынам і іншымі дзецьмі. Каб дапамагчы, трэба не проста знайсці нейкіх цётачак-дэфектолагаў ці псіхолагаў. Ты павінен разумець, што гэты чалавек можа даць твайму дзіцяці. Якая наступная ступень? Гэта фраза: «Хачу, каб ён быў, як усё»... Дык ён не будзе, як усе. Ёсць нейкая прыступка. Падыміся на яе і ўбачыш наступную. Усё залежыць ад нас. Трэба перастаць сябе шкадаваць. Плачце ў падушку па начах, калі дзіця спіць. Не губляйце час. Бачыце бяду — змагайцеся з ёй. Напішыце мне, я раскажу вам, як.

— Вы памятаеце, з чаго пачыналі? І што маеце сёння?

Аня: Мы цяпер звычайная сям'я. Ведаеце, мы ў кіно пачыналі хадзіць па 10 хвілін, проста каб Сцёпа разумеў, што трэба ціха пасядзець.

Сяргей: А цяпер ведаем, што спакойна паглядзім мультык і будзем яшчэ потым яго абмяркоўваць.

Аня: Мы цяпер атрымліваем асалоду ад жыцця. Так, працы напярадзе — безліч. Але мы бачым такі прагрэс, што нас ужо не спыніць.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Фота Надзеі БУЖАН.

ЭРМІТАЖНЫЯ МУРЛЫКІ

«Эрмікі» запрашаюць.

Калі будзеце ў Санкт-Пецярбургу, не забудзьцеся, акрамя магніцікаў, купіць на памяць яшчэ і сувенір з выявай ката ці кошкі. Па адной з легендаў, сам Пётр I прывёз вялізнага мурлыку з Галандыі і пасяліў яго ў старым Зімовым палацы. А імператрыца Лізавета Пятроўна, якая пакутавала ад полчышчаў пацукоў і мышэй, выдала ў 1745 годзе «Указ аб высылцы да двара катоў», згодна з якім трэба было даставіць з Казані «30 найлепшых і вялікіх мурлыкаў, здатных да лаўлення мышэй».

Асобы, набліжаныя да імператара

Патомкі тых катоў, на жаль, не перажылі страшную блакаду. Выпадковы спадарожнік па цягніку расказаў мне, што пасля вайны з Сібіры ў Піцер прывезлі ажно некалькі вагонаў «вусатых», каб выратаваць паўночную сталіцу ад грызуноў — яны не на жарт сталі пагражаць гораду на Няве.

Пра «эрмікаў» (скарочана — эрмітажных, або палацавых кошак) мне расказала яшчэ адна жыхарка Пецярбурга — маладая дзяўчына, якая прадавала майкі з іх сімвалічнымі выявамі. «У склепах Эрмітажа каля сотні гэтых прыгожых жывёл, — паведаміла яна. — Іх вельмі паважаюць і нават клічуць па імёнах».

Эрмітажныя мурлыкі ўдзельнічаюць у балях. Касцюмы ім шыюць сапраўдныя куцюр'е.

Сутарэнні Эрмітажа — ідэальнае месца для жыцця катоў. Тут суха, цёпла і светла. У дзвярах адмысловыя праёмы ў ніжняй частцы — каб кошкі маглі трапіць дадому ў любы час сутак.

Па Піцеры я гуляла ў лютым пад халодным дажджом — а гэта не вельмі спрыяльнае надвор'е для катоў. Напэўна, яны хаваліся дзесьці ў цёплых падвалах. Але летам, казала дзяўчына, каты выходзяць пагрэцца на сонейку і не супраць сфатаграфавацца з турыстамі на памяць.

Пры жаданні ў музеі вам раскажуць шмат цікавых гісторый пра чатырохногіх прыдворных. Іх тут вельмі паважаюць, бо яны ахоўваюць культурную спадчыну ад грызуноў. За пасляваенны час кошкі так распладзіліся, што ў 1960-я гады, кажуць, прыходзілася асабліва нахабных зганяць з царскага трона. З лішнімі праблем не было — іх разабралі ахвотныя. Гэта ж не нейкія там бадзяжныя жывёлы, а «асобы, набліжаныя да імператара».

Фотамастак Эрмітажа Юрый Маладкавец зрабіў цікавы фотапраект. Дзякуючы яму 12 пушыстых гадаванцаў атрымалі сусветную вядомасць. Аўтар не паленаваўся даць сваім мадэлям невялічкія характарыстыкі. Вакса, напрыклад, жыве выключна ў дварах Эрмітажа. Асоль можна сустрэць на Палацавай набярэжнай, дзе яна назірае за караблямі, якія праплываюць міма.

Дзверы музейных зал для катоў, безумоўна, зачыненыя. Найбольш прывілеяваныя маюць доступ у гаспадарчы аддзел, але большасць жыве ў «кухонным» дворыку Эрмітажа, які дасведчаныя людзі называюць «вялікі каціны падвал». Там супрацоўнікі падкормліваюць сваіх падапечных. Сутарэнні Эрмітажа — ідэальнае месца для жыцця катоў. Тут суха, цёпла і светла. У дзвярах адмысловыя праёмы ў ніжняй частцы — каб кошкі маглі трапіць дадому ў любы час сутак.

У Дзень эрмітажнага ката (раней адзначаўся ў сакавіку, а цяпер, па некаторых звестках, 21 красавіка) у Эрмітажы прахо-дзяць мерапрыемствы, прысвечаныя гэтым «байцам нябачнага фронту». Наведвальнікаў пускаюць у службовыя памяшканні: на гарышча і ў сутарэнні. Паглядзець на самых ганаровых у Расіі катоў не менш цікава, чым на славутыя калекцыі палаца.

Партрэты катоў Эрмітажа напісаў малады ўзбекскі мастак Эльдар Закіраў.

МУРкоўнае пірожнае і котакампот

Калі сустрэцца непасрэдна з эрмітажнымі кошкамі не пашчасціла, не сумуйце. Іх сваякі жывуць непадалёк ад Эрмітажа, ва ўтульнай котакавярні на вуліцы Якубовіча. Гэта прыкладна за 100 метраў ад Ісакіеўскага сабора. Прайсці міма немагчыма. На прыступках кавярні важна сядзіць пузаты металічны кот, які ўсім сваім выглядам запрашае сфатаграфавацца на памяць. А лепей зайсці ў госці. Дызайн памяшкання прадуманы да дробязяў. Кожны сантыметр нагадвае: «Увага, тэрыторыя кошак». Неабыякавыя людзі зрабілі для гэтых прыгожых жывёл нешта накшталт прытулку. Атрымалася так, што нават пачынаеш зайздросціць катам. Прыгожа жыць не забароніш! Тут можна выпіць кубачак гарбаты або кавы і пакаштаваць смачнае пірожнае. Напрыклад, смаката пад назвай «Мара кошкі Саксіі» каштуе 210 рублёў (прыкладна 60 тысяч беларускіх). «МУРкоўнае пірожнае» — 160 рублёў (45 тысяч беларускіх). Запіць усё гэта можна для поўнага шчасця «Котакампотам» (ён тут усяго 70 рублёў, нашымі — тысяч 20). І — гуляць дык гуляць — купіць экскурсію за 350 рублёў (амаль 100 тысяч. У Эрмітаж, калі што, прыблізна столькі ж) у будні або за 500 у выхадныя і пазнаёміцца з тымі, дзеля каго, па сутнасці, сюды і прыйшлі. На момант майго наведвання пушыстых жыльцоў тут было 24 — розных парод і характараў. Калі ты бачыш гэтых цудоўных прыгажуноў і прыгажунь, ніякіх грошай не шкада. Заадно ўбачыце тую самую Саксію, чыю «мару» паспыталі.

На стасункі з гадаванцамі адводзіцца каля гадзіны. Не факт, што ўсе з іх пажадаюць аддаць вам даніну павагі. Але настрой будзе забяспечаны. Калі з'явіцца жаданне ўзяць у падарунак сімпатычнага пушыстага сябра, тут абяцаюць дапамагчы. На крайні выпадак, купіце сувенір. Тут яны на любы густ. У тым ліку і паштоўкі з вышэйзгаданымі «эрмікамі».

Наогул, прадметаў з сімволікай палацавых катоў у Піцеры больш чым дастаткова. Іх можна знайсці ў Кунсткамеры, іншых блізкіх да Зімовага палаца музеях і крамах. У Эрмітажы прадаецца каля двух дзясяткаў (можа вы налічыце і болей) розных прыемных дробязяў на кашэчую тэматыку — ад статуэтак да маек. Каштуе гэта не вельмі танна, але, здаецца мне, што «эрмікі» будуць удзячныя за ўвагу і вам абавязкова пашчасціць.

З піцерскімі катамі знаёмілася Нэлі ЗІГУЛЯ.

zigulya@zviazda.by

Міма гэтага месца нельга прайсці абыякавым.

ДАЛЁКА І БЛІЗКА

Вясна без Масленіцы не надыходзіць. Ну, або так: не з'ясі тлусты блінок, не наведаешся ў госці да цешчы, не скоцішся кулём з горкі, не нацешышся на кірмашы са скамарохаў і не прымеш удзел у спальванні чучала Зімы — лічы, што спазніўся на ўсю вясну. Між тым, у Белавежскай пушчы завяршаецца масленічны тыдзень. 12 сакавіка там адбудуцца вялікія вясёлыя гулянні пад традыцыйныя пушчанскія напоі і стравы. У той жа дзень Масленіца святкуецца ў шмат якіх іншых месцах — каб кожны паспеў атрымаць свой тлусты блінок і сваю шчаслівую вясну.

Да 13 сакавіка ў Мінскай абласной бібліятэцы імя Пушкіна праходзіць першы Мінскі фестываль праваслаўнай культуры. Тут можна набыць вырабы манастырскіх падворкаў — сабе і ў падарунак дарагому чалавеку, паглядзець батлейку, сустрэцца з цікавымі людзьмі і атрымаць адказы на вечныя пытанні, зададзеныя ў добрым месцы ў добры час.

Льву Баксту, мастаку і тэатральнаму дэкаратару (які, між іншым, яшчэ і пісаў — не толькі лібрэта для пастановак славутых «Рускіх сезонаў», але і біяграфічную прозу) у красавіку спаўняецца 150 гадоў. Ён нарадзіўся ў Гродне, праславіўся ў Парыжы, называецца рускім мастаком, а выстава ў яго гонар праходзіць да 17 красавіка ў Мінску, у Нацыянальным мастацкім музеі. І варта яе наведаць, бо Бакст... гэта Бакст. Зірніце, як ён адлюстраваў купальшчыц Лідо. Натхняюць!

Мірскі замак запрашае ў свае сцены ў любы час, каб прапанаваць незвычайнае — падарожжы ў часы мінулыя. Вось вы трапляеце ў скляпенні замка — і думаеце, што ўбачыце выключна гаспадарчыя прылады і сховішча харчовых запасаў, а на самай справе там вас чакае жонка галоўнага кухара з падрабязным аповедам пра абавязкі тамтэйшай прыслугі. Гэта павучальна. Або ідзяце ў Паўночную вежу — так сабе, прагуляцца, а сустракаеце адну з Радзівілаў, і яна вам пра сваякоў ахвотна ўсё расказвае. Цікава? Не прапусціце і залу партрэтаў: там са сваёй жонкай станцуе перад вамі сам князь Караль Станіслаў — той, што Пане Каханку.

У Нясвіжы — як у Парыжы. Калі марылі трапіць у Луўр, але пакуль не ўдалося, Нясвіж — самае тое. Зазірніце ў касцёл Божага Цела — паглядзець на «Тайную вячэру» 1752 года, мастака Гескага, яна размешчана ў галоўным алтары. Або на фрэскі XVIII стагоддзя, зробленыя тым жа майстрам. Ці на надмагільныя бюсты славутых калісьці асоб. Не прапусціце магчымасці спусціцца ў скляпенне касцёла — у фамільную крыпту князёў. Сем дзясяткаў пахаванняў дынастыі Радзівілаў у адным месцы — гэта вельмі ўражвае. Ёсць дзе падумаць пра вечнае. Ды і вечны горад — не толькі Парыж.

Ведаеце, што такое індэкс забароненых кніжак? А ведаўскі працэс? Няведанне азначае толькі тое, што вас ніколі не судзілі за вядзьмарства і вы не чарнакніжнік. Але вы можаце прасякнуцца адпаведным настроем, каб зразумець, ад чаго, магчыма, уратаваліся, нарадзіўшыся ў сваё стагоддзе, а не раней! У музеі гісторыі рэлігіі ў Гродне адкрылася выстава «Таямніцы інквізіцыі». Калі да Гродна вам далекавата, захапіце ў дарогу том Каратквевіча з «Хрыстом...», які «...прызямліўся ў Гародні», — вельмі адпавядае.

На падарожжы натхняе Святлана ДЗЯНІСАВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Поставы, ул. Солнечная, 24 Витебской области

Дата, время, место проведения аукциона	**24 марта 2016 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, малый зал)**						
Адреса, площади, кадастровые номера земельных участков, начальная цена	**№ лот**	**Адреса участка**	**Площадь, га**	**Кадастровый номер**	**Наличие ограничений в использовании**	**Начальная цена, руб.**	**Сумма подлежащих возмещению организатору аукциона расходов на его проведение**
	1	Витебская обл., Поставский р-он, г. Поставы, ул. Солнечная, 24	0,0876	224050100001004596	Ограничений (обременений) не имеет	80 000 000	15 940 543
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона	- в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона; - в течение двух месяцев после утверждения протокола аукциона обратиться за государственной регистрацией прав на земельный участок; - получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома; - приступить к занятию земельного участка (начать строительство) в течение года со дня государственной регистрации создания земельного участка.						
Порядок осмотра на местности земельного участка	В рабочие дни с 8.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома: г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб. 11						
Перечень документов, которые необходимо представить участникам аукциона до его начала	- заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе); - квитанция об уплате задатка; - ксерокопия стр. 25, 31, 32,33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования; - представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.						
Место, дата и время начала и окончания приема заявлений	г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 со дня публикации извещения до 18.03.2016 включительно						
Размер задатка, срок и порядок его внесения	10% от начальной цены соответствующего участка до подачи заявления на счет Поставского райисполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе						
Адрес и номер контактного телефона комиссии	г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00), телефоны: 8 (02155) 43180, 41132						

ЗАСО «Промтрансинвест» предлагает принять участие в процедуре закупки № 2016-322670, размещенной на сайте http://www.icetrade.by,

права пользования программным обеспечением Microsoft. УНП 100357923

ОБЪЯВЛЕНИЕ

ОАО «Минскоблхлебопродукт»

извещает, что объявленная повестка дня отчётно-выборного собрания акционеров, которое состоится 30 марта 2016 года, дополнена следующим вопросом:

«О внесении изменений и дополнений в устав Общества».

Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт»

Тел. 220-59-17

УНП 600013173

18 марта 2016 года

состоится повторное очередное общее собрание акционеров открытого акционерного общества

«Лукомльэнергомонтаж»,

расположенного по адресу:

Витебская обл., г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8

Собрание пройдет по адресу:

г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, актовый зал.

Повестка дня собрания:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2015 году и основных направлениях деятельности Общества на 2016 год.
2. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2015 год.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчётов о прибыли и убытках Общества за 2015 год.
4. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении Общества, (покрытия убытков) за 2015 год и выплате дивидендов.
5. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2016 г. и первый квартал 2017 г.
6. О утверждении локальных нормативных актов Общества.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. О принятии решения о приобретении ОАО «ЛЭМ» его акций, отчуждаемых акционерами в период по 03 сентября 2016 г., определении цены приобретения акций, отнесения и компетенции Наблюдательного совета права определения цены приобретения указанных акций.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 9 марта 2016 г., по месту нахождения Общества (приемная) с 13.00 до 16.00.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 08.00 до 09.45.

Время начала проведения собрания: 10 часов 00 минут.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 1 марта 2016 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
- акционеру Общества – паспорт;
- представителю акционера – паспорт и доверенность. УНП 300007839

Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 25 марта 2016 г. проводит повторный открытый аукцион с условиями № 03-У-16 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на одиннадцати земельных участках в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб.	Наличие обременений	Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	г. Минск, пр. Дзержинского	0,50	для строительства объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями по пр. Дзержинского» (повышенной комфортности)	2 252 194 817	340 000 000	53 155 609	снос нежилых зданий по ул. Розы Люксембург, 89А	373 470 000 руб.
2	г. Минск, ул. Радиальная – ул. Алтайская	3,0810	для строительства объекта «Жилая многоквартирная застройка по ул. Радиальная – ул. Алтайская» (повышенной комфортности)	9 921 823 500	1 488 000 000	150 293 199	отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Солтыса, 2, 4, 4А, 6, 6А, 6Б, 8, 8А.; пер Холмогорский 4-й, 2, 4, 4а, 6, 8; пер. Наклонный 1-й, 2а, 2Б; пер. Холмогорский 3-й, 3, 3 «А», 7, 7а	29 473 410 900 руб.
3	г. Минск, ул. Волгоградская	0,6583	для строительства объекта «Многоквартирный жилой дом по ул. Волгоградской» (повышенной комфортности)	2 729 508 963	410 000 000	191 969 241	отселение и снос в установленном порядке жилых и нежилых строений по ул. Волгоградской, д. 82, 84; по ул. Новгородской, 3, 5. Демонтаж распределительных инженерных сетей	57 294 298 600 руб.
4	г. Минск, ул. Машиностроителей – МКАД (9 км)	1,4228	для строительства объекта «Многофункциональный комплекс с паркингом по ул. Машиностроителей-МКАД (9 км)» (состав объекта: торговый комплекс – 5000 кв.м, административный – 5000 кв.м, встроенный паркинг, производство – 10 000 кв.м)	4 084 919 607	600 000 000	116 840 302	снос зданий и сооружений по просп. Партизанскому, 160А. Демонтаж внутриплощадочного водопровода диаметром 100 мм, частичный демонтаж сетей ливневой канализации	2 008 102 425 руб.
5	г. Минск, в районе ул. Ваупшасова– МКАД (4 км)	1,6426	для строительства объекта «Объект придорожного сервиса (гостиница, кафе, торговля) в районе ул. Ваупшасова – МКАД (4 км)»	5 751 018 480	800 000 000	117 439 441	снос зданий и сооружений по ул. Карвата, 100	11 667 181 620 руб.
6	г. Минск, ул. Радиальная	1,9400	для строительства объекта «Многоквартирная жилая застройка по ул. Радиальной» (повышенной комфортности)	6 243 192 740	900 000 000	169 909 876	снос зданий и сооружений по ул. Радиальная, д. 28, 30, 32, 34, пер. Холмогорский 1-й д. 11, 13, пер. Холмогорский 2-й д. 3, 5, 7, 9, 11, 13. 15, 19, 21, 25, 27, пер. Переходной 2-й д. 10, 12, 14, 16. Демонтаж распределительных сетей к сносимым домам	34 676 787 600 руб.
7	г. Минск, ул. Айвазовского	0,8470	для строительства объекта «Жилая многоквартирная застройка по ул. Айвазовского» (повышенной комфортности)	2 772 982 575	550 000 000	131 892 835	отселение и снос жилых и нежилых строений по проезду Энергетическому,1, 3, 4, 5, 7, 9, 11 по ул. Айвазовского, 3, 5, 7, 9, 11, 13	28 413 563 200 руб., а также затраты по отселению жильцов с 68,86 кв. м государственного жилищного фонда
8	г. Минск, ул. Широкая	0,6630	для строительства объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения по ул. Широкой» (повышенной комфортности)	2 215 413 145	440 000 000	144 114 321	отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Широкая, 2, 4, корп. 2, 6, 10	34 270 687 200 руб., а также затраты по отселению жильцов с 104,70 кв. м государственного жилищного фонда
9	г. Минск, в границах ул. Одесская– ул. Лазо – ул. Ушакова	2,6637	для строительства объекта «Многоквартирные жилые дома со встроенными помещениями общественного назначения по ул. Одесская – ул. Лазо – ул. Ушакова» (повышенной комфортности)	5 572 652 910	1 110 000 000	222 861 877	отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Автозаводской, 8, 10, 12, 14, 15, 16, 17, 18, 19, 20, 22, 23, 24, 25, 26, 28, 30, 32, 38, 40, 42, 44, 46, по ул. Лазо, 42, 44, 46, 48, 50	34 404 255 720 руб., а также затраты по отселению жильцов с 320,85 кв.м государственного жилищного фонда
10	г. Минск, ул. Брестская	1,2143	для строительства объекта «Объект административно-производственного назначения с автосервисом по ул. Брестской»	3 322 517 680	660 000 000	69 219 925	отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Брестской, 8, 10, 12, 12А, 14, 16	15 137 100 000 руб., а также возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 72 114 970 руб. *
11	г. Минск, ул. Р. Люксембург	0,6600	для строительства объекта «Многоквартирная жилая застройка по ул. Р. Люксембург» (повышенной комфортности)	1 659 675 820	330 000 000	156 877 626	отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Р. Люксембург, 152, 156, 158, ул. Карпова, 6	28 946 735 000 руб., а также затраты по отселению жильцов с 195,18 кв.м государственного жилищного фонда

Основные условия проектирования и строительства объекта указаны в акте выбора места размещения земельных участков и прилагаемой к нему документации.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится 25 марта 2016 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток не позднее 21 марта 2016 г. в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

представить в коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона, (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющей личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6, с 10 марта 2016 г. по 21 марта 2016 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона*, в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;**

***** – единственный участник несостоявшегося аукциона – выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка в частную собственность.

Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка.

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения), Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.

■ У бацькоўскі нататнік

А, У, ЫІ... або Першы гук — ён самы важны

Настаўнікі б'юць трывогу: дзеці няздольныя адрозніваць гукі, а значыць, не могуць засвоіць граматыку! Новае пакаленне не толькі не прамаўляе іх правільна, але і не чуе, і не адрознівае на пісьме. Адсюль рост парушэнняў чытання і пісьма (дыслексій і дысграфій).



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

МУЛЬЦІК — ВЫКЛЮЧЫЦЬ

За апошнія 10-15 гадоў у значна большай колькасці дзяцей пачалі выяўляцца парушэнні, звязаныя з маўленнем. І такая тэндэнцыя характэрная не толькі для нас, але і для многіх іншых краін.

Бабулі і дзядулі цяпер працуюць і жывуць асобна ад унукаў. Яны ўжо не спяваюць калыханкі і не заўсёды расказваюць казкі. Мамы і таты таксама: па-першае, не ўмеюць, па-другое, не жадаюць, па-трэцяе, ім няма калі.

У чым прычына? Адназначнага адказу няма, але давайце паразважаем. Усё за тыя ж апошнія гадоў дваццаць лад жыцця і дарослых, і малых вельмі моцна змяніўся. Практычна ўсе дзеці надзвычай шмат часу праводзяць перад тэлевізарам і камп'ютарам. Яны перасталі гуляць на вуліцы. У іх наогул няма часу на гульні! А гульня для дашкольніка — не проста забава ці гультайства. Гэта важны момант развіцця, фарміравання ўяўленняў пра свет і сваё месца ў ім.

САМО НЕ З'ЯВІЦЦА...

— Першае, на што неабходна звяртаць увагу, калі дзіця расце, — гэта разуменне ім таго, пра што кажуць іншыя людзі, — тлумачыць Таццяна Ласіцкая. — Калі дзіця не разумее маўленне іншага чалавека, яго ўласнае маўленне будзе фарміравацца з затрымкай. Абавязкова трэба ісці да лагапеда, калі да 2 гадоў дзіця не размаўляе або ў 2 з паловай кажа так, што яго ніхто не разумее. Сцвярджэнне аб тым, што да 3 гадоў трэба пачакаць і маўленне з'явіцца само, памылковае. Размаўляць дзіця будзе, але што гэта будзе за маўленне, якой якасці?

Сёння шмат дзяцей маюць затрымкі маўленчага развіцця, абумоўленага парушэннем кантактаў з дарослымі. У такіх выпадках патрабуюцца працяглыя заняткі па карэкцыі з псіхолагам і лагапедам. І чым раней яны пачнуцца, тым эфектыўней гэта будзе.

Сучасныя бацькі нават радуюцца, што дзіця гадзінамі сядзіць перад тэлевізарам і не дастаўляе клопату. Уключыць мульцік — самы просты спосаб нейтралізаваць гарэзу. Але ж гэта шкодна для зроку, для псіхікі ўрэшце. Вялікі аб'ём зрокавай інфармацыі ўздзейнічае на дзіцячы мозг, які не ў стане гэту інфармацыю перапрацаваць. Хуткая змена вобразаў і карцінак знясільвае нервовую сістэму, эмацыйная сфера перагружаецца, парушаецца сон і г.д.

Амерыканская асацыяцыя педыятраў правяла ў канцы 1990-х гадоў даследаванне таго, як тэлебачанне ўплывае на псіхіку дзіцяці. І дала рэкамендацыі: да паўтара года дзецям наогул нельга глядзець тэлевізар! З 1 года 6 месяцаў да 3-х — максімум 15 хвілін у дзень, з 6-ці да 8-мі — не больш як паўгадзіны!

— Бацькі цяпер нават ганарацца, што дзіця ў тры годзікі жыве ў згодзе з камп'ютарам, — разважае **настаўнік-лагапед 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Таццяна ЛАСІЦКАЯ.** — Важна разумець, што камп'ютар, як і тэлевізар, не можа замяшчаць сабой усё астатняе. Добра, калі выкарыстоўваць іх у разумных межах, а не для таго, каб пазбавіць сябе лішняга клопату. Для паўнавартаснага развіцця маўлення дзіцяці неабходны суразмоўца! Ні тэлевізар, ні камп'ютар ім не з'яўляюцца!

МОРКВУ — ЖАВАЦЬ

Змянілася і сучасная сям'я. Бабулі і дзядулі цяпер працуюць і жывуць асобна ад унукаў. Яны ўжо не спяваюць калыханкі і не заўсёды расказваюць казкі. Мамы і таты таксама: па-першае, не ўмеюць, па-другое, не жадаюць, па-трэцяе, ім няма калі. А падчас чытання казак, вершаў фарміруецца слыхавое ўспрыманне і ўвага — уменне слухаць і чуць. Гэта і ўплывае на фарміраванне фанематычнага слыху, неабходнага для чытання і напісання.

Неяк незаўважна змяніўся нават характар дзіцячай ежы. Моркву і яблык, якія трэба грызці, выцеснілі пюрэ. Некаторыя мамы да двухгадовага ўзросту даюць ежу, перацёртую праз блэндар, хоць дзіця ўмее добра жаваць. Усё гэта дрэнна адбіваецца на развіцці артыкуляцыйнага апарату. Бо падчас жавання ў роце ствараюцца пэўныя змычкі для фарміравання зычных гукаў. Ужыванне аднаго яблыка або адной морквіны ў дзень — нармальная неабходнасць.

ЯК ЗАПАДОЗРЫЦЬ ПАРУШЭННІ МАЎЛЕННЯ?

У 4 месяцы дзіця не ўсміхаецца, няма комплексу ажыўлення.

У 5 месяцаў не прыслухоўваецца да гукаў, музыкі, голасу.

У 7 — не пазнае голас мамы, не рэагуе на інтанацыю, не цікавіцца цацкамі.

У 9 — няма лепету, не паўтараюцца за дарослым гукі, склады, рухі кшталту «ладкі».

У 1 год не махае рукой, калі развітваецца, не паказвае на прадметы, не вымаўляе ніводнага слова і не выконвае простыя просьбы «Дай», «Пакажы».

У 1 год 6 месяцаў не паказвае і не называе маму і тату, не будуе вежу з 2-3 кубікаў, не выкарыстоўвае ўказальны жэст, не разумее аднаскладовую інструкцыю.

У 2 гады не карыстаецца 5-10 словамі, не паказвае на фота маму і тату, не выконвае двухскладовую інструкцыю «Пайдзі на кухню і пастаў талерку на стол».

У 2 гады 6 месяцаў маўленне не зразумелае навакольным, не сфармуляваныя паняцці аб велічыні, форме, колеры прадметаў, дзіця не агучвае сваю гульню і не кантактуе з дзецьмі.

Да 3 гадоў не размаўляе простымі фразамі, не можа назваць сваё імя і прозвішча, расказаць просты верш, не кажа пра сябе «я сам», не адказвае на пытанні.

Да паўтара года дзецям наогул нельга глядзець тэлевізар! З 1 года 6 месяцаў да 3-х — максімум 15 хвілін у дзень, з 6-ці да 8-мі — не больш як паўгадзіны!

У развіцці маўлення ўзрост ад нараджэння да 3 гадоў вельмі важны. Гэта час імклівых змяненняў у псіхічным і фізічным развіцці. Усё, што мы паспяваем закласці да гэтага ўзросту, дзіця пасля развівае і выкарыстоўвае. Нездарма ў нашай краіне агульнапрынятым лічыцца штогадовы агляд лагапеда з раннягa дашкольнага ўзросту і да моманту паступлення ў школу.

Святлана ПРОТАС.
protas@zviazda.by

■

ГУЛІ-ГУЛІ

Як зразумець, што маўленне ў вашага дзіцяці развіваецца нармальна? Наколькі тэрмінова трэба звяртацца да лагапеда? Вы будзеце ведаць адказы на гэтыя пытанні, калі будзеце знаёмыя з усімі этапамі развіцця дзіцячага маўлення.

Да канца **1 месяца** жыцця здаровае дзіця ўжо рэагуе на зварот да яго: перастае плакаць, засяроджваецца на дарослым, калі да яго звяртаюцца. Пры фізічным напружанні дзіця крэкча, выдае гукі «а», «э».

У **2 месяцы** дзіця ўсміхаецца падчас кантактаў. Пачынае крычаць, і ў крыку з'яўляюцца розныя інтанацыі. Можа крычаць цярпліва, агідна, саступаючы, пратэстуючы. Крык можа быць і патрабавальным, заклікальным, капрызным. З'яўляецца так званае «гуленне» — вымаўленне такіх простых гукаў, як «а», «у», «ы», часам у спалучэнні з «г» або «к».

3 месяцы. Замест крыку ўсё часцей чуваць хныканне і плач. Дзіця смяецца і павісквае ў адказ на радасны зварот дарослага. Дзіця выдае гукі «б-у», «в-і», «а-а-бм-бм», «бль», «у-гу», «бу» і г.д.

4 месяцы. Гучны смех пры станоўчых эмоцыях, павісквание на казытанне. Падчас гулення можна пачуць «а-о-у», «ю-а-а». Гуленне становіцца працяглым. Гукі вымаўляюцца пад кантролем слыху. Таму становіцца магчымым сапраўдны дыялог: вы паўтараеце дзіцячыя гукі, дзіця сцішваецца пры гэтым і прыслухоўваецца да вас, а пасля пачынае гуліць яшчэ больш гучна і актыўна.

5 месяцаў. Зычныя «п», «б», «м», «т», «д» звязваюцца з галоснымі: «ба, га, да, ма, ам, та». З'яўляюцца «а-ма» ці «а-ба», «а-на», «а-да». Не прамаўляюцца асобныя склады кшталту «ма», толькі «ма-ма» або «ма-ма-ма-ма». Некаторыя мамы расказваюць пасля, што іх дзіця ўжо з 5-6 месяцаў вымаўляла словы.

6 месяцаў. Дзіця прыслухоўваецца да голасу дарослага, правільна рэагуе на інтанацыю, пазнае знаёмыя галасы.

7 месяцаў. Выкарыстоўваюцца розныя галасавыя інтанацыі для прыцягнення ўвагі, лепет усё больш актыўны.

8 месяцаў. Узнікае рэакцыя на незнаёмы твар, дзіця можа заплакаць. Адзін з найважнейшых паказчыкаў нармальнага развіцця маўлення — лепет, паўтарэнне аднолькавых складоў: ба-ба, да-да, папа. Асвойваюцца гукі п, б, м, г, к, э, а.

9 месяцаў. Актыўныя кантакты з дапамогай жэстаў, з радасцю гуляе ў ладкі.

10 месяцаў. Ёсць хоць бы адно-два лепетныя словы кшталту ляля, баба. Дзіця паўтарае за дарослым новыя склады.

11 месяцаў. Першыя словы звычайна абазначаюць блізкіх «ма», «па», «ба», а таксама дзеянні і прадметы, якія часта называюць бацькі: «ам», «ам-ам», «ав», «в-ав», «бі-бі», «кіс-кіс», «бай».

1 год. Ва ўжыванні — 3-5 лепетных слоў. Аднак сэнс у іх вельмі шырокі. Слова «мама» можа азначаць і зварот, і скаргу, і настойлівае ўказанне, просьбу ўзяць на рукі. «Да-да» можа азначаць: «Дай мне хутчэй маю бутэлечку!».

1 год 3 месяцы. У моўным запасе да 10 слоў. Дзіця разумее простую інструкцыю без жэсту. «Дай ручку!», «Дзе тата?». Знаёмыя словы (лялька, мячык) паказвае на малюнку.

1 год 6 месяцаў. Паказвае адну з частак цела, у моўным запасе каля 20 слоў.

1 год 9 месяцаў. Паказвае тры часткі цела, выкарыстоўвае фразы з двух слоў «Мама, дзі», «Дай ляля».

2 гады. Паказвае пяць частак цела, слоўнікавы запас мінімум 50 слоў. Правільна разумее інструкцыю з двух этапаў «Пайдзі на кухню і прынясі кубак», будуе сказы з двух слоў «Тата бі-бі».

2 гады 6 месяцаў. Называе многія часткі цела. Моўны запас вялікі. Кажа пра сябе «Я пайшоў», «Я сам», адказвае на пытанне «Як цябе завуць?», будуе фразы з 3-4 слоў, задае пытанні «Што гэта?», «Хто гэта?».

3 гады. Аб'ём слоўніка — да 1000 слоў. Простыя сказы з 3-4 слоў. Маўленне зразумелае не толькі блізкім. Дзіця размаўляе з іншымі людзьмі, расказвае пра тое, што адбылося, адказвае на пытанні па сюжэтным малюнку, расказвае знаёмую казку, з'яўляецца схільнасць да рыфмавання. Можа вывучыць кароткі верш. Надыходзіць узрост «чамучкі» — пазнання свету.

■ Фотаздымак з гісторыяй

ШЧЫРАВАЛІ ДРУЖНА, З ЗАПАЛАМ

Гэтыя дзве неверагодныя картачкі мы атрымалі ад Таісы НЕСЦЯРОВІЧ з вёскі Кляннік Смалявіцкага раёна. «Убачыла ў газеце «Звязда», якую выпісваю ўжо даўно, фотаздымкі, прысланыя на конкурс, і вырашыла таксама паўдзельнічаць, — піша шаноўная Таіса Антонаўна. — Мая радзіма — вёсачка Лоўцавічы Вілейскага раёна. Там я нарадзілася, там жылі мае бацькі, родзічы, суседзі. Але, на жаль, цяпер у Лоўцавічах засталося ўсяго толькі некалькі чалавек. Праўда, летам вёска «люднее»: з'язджаюцца дачнікі.

Фотаздымкі, якія я вам дасылаю, адлюстроўваюць жыццё вёскі недзе ў 1960-я гады. У нашым саўгасе «Карпавічы» (а ў час, калі рабіліся здымкі, яшчэ быў калгас «Лукавец») сеялі вельмі многа лёну. Я добра не памятаю (а папытацца ўжо няма ў каго), як яго абабівалі ўручную, а потым прасейвалі, а па-вясковаму — «пафавалі». Звазілі на падводах, трактарах. Працавалі ўсе дружна, з запалам.

Наогул, наша вёска мае цікавую гісторыю. Да 1939 года гэта была Заходняя Беларусь. А побач, недзе праз чатыры кіламетры, — Савецкі Саюз. Мая мама, Бекіш Тамара Кірылаўна (на фотаздымку ў цэнтры), скончыла пяць класаў польскай школы і была даволі адукаваным чалавекам. Яна вельмі шмат мне расказвала пра той час. Было няпроста, але людзі сябравалі паміж сабой, стараліся бачыцца, хадзіць адзін да аднаго ў госці. Польскія салдаты дапамагалі ім у гэтым.

А потым вайна. Вёску, якая была партызанскім краем, бамбілі, было дзве блакады...

Пасля вайны жылі цяжка. Хоць я і нарадзілася ў 1954 годзе, але таксама адчула многія цяжкасці. Жылі бедна, але дружна. Памятаю, як збіраліся чамусьці ў нашай хаце. У цэнтры вісела газавая лямпа, а вакол вялікага стала сядзелі жанчыны: хто вышываў, хто праў, хто цыраваў адзежу. Абмяркоўвалі мясцовыя навіны, спявалі беларускія песні, расказвалі розныя гісторыі. Дапамагалі адна адной, былі разам у горы і радасці.

Ужо амаль нікога няма з гэтых людзей. Але я памятаю іх запал, шчырасць, прагу да працы. Любіць жыццё, паважаць адзін аднаго, працаваць так, каб было радасна на душы — вось тое, што іх усіх аб'ядноўвала.

Мой бацька, Бекіш Антон Лявонавіч, пабываў у Германіі (яго забралі ў першы год вайны) і ваяваў на фронце. Быў цяжка паранены, атрымліваў пенсію па інваліднасці (у яго не было левага вока і не падымалася левая рука), але таксама працаваў. Ён у цэнтры на другім фотаздымку.

Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zvyazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца

■ Маміны дзённікі

— Куды ідзеш? — пытаецца трохгадовы Даня (у гэты час хварэў).

— Збіраюся на працу з'ездзіць ненадоўга.

— А мяне куды дзенеш?

☺ ☺ ☺

— Дай чаго-небудзь салодкага, — просіць сын.

— Што хочаш? Торт?

— Не, крэму адрэж.

☺ ☺ ☺

Мой Даня ўжо трохі хітруе. Спачатку кажа:

— Мамачка, ты такая прыгожая! — а праз хвіліну:

— Дай цукерку!

— Мы з табой мужчыны, — кажа бацька Даню.

— Я не мужчына, я хлопец, — паправіў яго сын.

☺ ☺ ☺

Даня з дзядулем выбіраюць у краме прысмакі:

— Які пачак будзем браць, вялікі ці малы? — пытаецца дзядуля.

— Вялікі! Мама ўсё роўна патрошку дае.

☺ ☺ ☺

— Што маме будзем дарыць? — пытаецца тата ў сына.

— Ты прыдумай, а я павіншую! — знайшоўся малы.

☺ ☺ ☺

Адчыніла верхнія дзверцы ў шафе. Сын убачыў:

— Ого! Колькі ўсяго ад мяне схавала!

☺ ☺ ☺

Дзядуля накупляў Даню цэлую сумку прысмакаў.

— Навошта столькі? — пытаецца бабуля.

— Гэта дзіцячая ежа, — растлумачыў Даня.

☺ ☺ ☺

Робім пакупкі. Даня паклаў у кошык міску для сабакі.

— Навошта? — пытаюся, — у нас жа сабакі няма.

— Купім!

— Навошта?

— Дом ахоўваць.

Аказваецца сын чуў, як мы з мужам марылі пра загарадны дом.

☺ ☺ ☺

Даня ўбачыў у краме надзіманы басейн.

— Хачу басейн, — просіць дома.

— А дзе ўзяць? — пытаюся.

— Купіць.

— А за што?

— За добрыя паводзіны!

☺ ☺ ☺

Сын доўга назірае, як птушкі кружаць каля гнязда, лётаюць туды-сюды.

— А куды яны лётаюць?

— Шукаюць ежу для птушанят, збіраюць чарвячкоў.

— Як дзед Вова?

(Наш дзядуля часта купляў унуку жэлацінавых чарвячкоў і жартаваў, што назбіраў іх па дарозе.)

☺ ☺ ☺

Робім у вёсцы рамонт. Паклеілі шпалеры.

— Трэба было б яшчэ падлогу пафарбаваць, — кажа бабуля.

— Як жа мы хадзіць будзем? — здзівіўся Даня.

☺ ☺ ☺

Доктар раіць паіць сына казіным малаком.

— У маёй Светы (бабуля) толькі карова ёсць, — удакладніў малы.

Занатавала Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ.

А пра што гавораць вашы дзеці?

Дасылайце свае гісторыі

■ Смачна есці!

А МЫ МАСЛЕНКУ ЧАКАЛІ, УСЕ АЛАДКІ ВЫПЯКАЛІ

Вось і прыйшла доўгачаканая вясна, а разам з ёю і свята, якое ў народзе называюць Масленіцай. Галоўным пачастункам на працягу масленічнага тыдня, згодна з традыцыяй, з'яўляюцца... Правільна — блінцы! Напэўна, таму што яны вельмі падобныя да сонца, якому людзі вельмі рады пасля зімы. Нашы чытачы таксама не спяць у шапку: здзіўляюць сваіх блізкіх бліннымі кулінарнымі эксперыментамі і дзеляцца праверанымі рэцэптамі з намі (за што ім вялікі дзякуй!).

Чароўныя торбачкі

«У мяне трое дзетак і муж, які любіць смачна паесці, — піша наша **чытачка з Іванцэвіч Таццяна.** — Таму, каб дагадзіць усім чацвярым, часта гатую «Чароўныя торбачкі» з рознымі начынкамі. Вырашыла падзяліцца сваёй «палачкай-выручалачкай» і з чытачамі «Звязды».

Для пачатку трэба напячы тонкіх бліноў — столькі, колькі вы плануеце зрабіць торбачак. Цеста замешвайце па сваім любімым праверaным рэцэпце (ён, пераканана, ёсць у кожнай гаспадыні). Начынку для гэтых мяшочкаў, як, у прынцыпе, і для звычайных бліноў, можна падабраць абсалютна розную. Галоўнае, каб яна не была вадкай. Асабіста мае сямейнікі любяць з тваражком і разынкамі; з сырам; з салатай «Аліўе» (дарэчы, салаты падыходзяць любыя!); з жульёнам ці з грыбамі, абсмажанымі з цыбуляй, морквай і зяленівам. На сярэдзіну кожнага бліна выкладаю па 2 ст. лыжкі начынкі. Затым збіраю краі бліна дагары (так, каб атрымаўся мяшэчак), і акуратна абвязваю пяром зялёнай цыбулі (ці замацоўваю крыху размочанай у малацэ сушкай). Шаноўныя гаспадынькі, не бойцеся эксперыментаваць з рознымі начынкамі, здзіўляйце сваіх гасцей новымі смакамі!

Скажаце: «Прыгожа, але ж, напэўна, нязручна есці, усё будзе вывальвацца». Мы таксама так думалі. Але рашэнне падказалі дзеці. Блін трэба ўзяць за «хвосцік», перавярнуць і адкусваць пакрыху, тады ўся начынка застаецца ўнутры. Напрыканцы з'есці «хвосцік». Дарэчы, гэтыя торбачкі мы апошнім часам гатуем усёй сям'ёй на выхадных. Я пяку бліны, муж выдумляе начынку, а дзеці фармуюць мяшэчкі».

Курнік

«Я вельмі люблю «Смачны блог» Таццяны Назарук, — піша **Марына П. з Мінска.** — Выпісваю сабе ў сшытак адтуль розныя рэцэпты. Хачу падзяліцца адным з іх.

У нядзелю чакаю гасцей і збіраюся прыгатаваць курнік. Летась ён пайшоў «на ўра», і сваякі заказалі яго і на гэты раз. Мой курнік не зусім аўтэнтычны — у ім няма курыных грабеньчыкаў і грэчкі — але ён найбольш аптымальны ў сучасных рэаліях.

Для бліноў вам спатрэбіцца: 1 яйка, 350 мл малака, 5 ст. лыжак з верхам мукі, соль і цукар на смак. ***Для цеста:*** каля 400 г мукі, 100 г масла, 1 яйка, 1/4 шклянкі малака, 3 ст. лыжкі смятаны, у тры пальцы соды. ***Для начынкі:*** 1 курыца (прыкладна 1,5 кг), 400 г грыбоў (у ідэале лясных, але шампіньёны таксама добра пайшлі), 1 сярэдняя цыбуліна, 200 г адварнога рысу, пучок зеляніва (пятрушка і кроп), 2 варanыя яйкі, соль і перац на смак.

Курыцу варым у падсоленай вадзе каля гадзіны, затым вымаем і астуджаем. У гэты час гатуем цеста. Змешваем размякчанае масла, смятану, малако і ўзбітае яйка. Паступова дабаўляем соду і муку, замешваем мяккае цеста. Накрываем яго і ставім хвілін на 40 у халадзільнік.

Далей пячэм бліны. Нам спатрэбіцца 8-9 штук.

Затым рвём на маленькія кавалачкі курынае мяса. Рыс змешваем са здробненым яйкам і зяленівам. Грыбы наразаем невялікімі кавалачкамі і разам з дробна нарэзанай цыбуляй абсмажваем на алеі. Апошнія дзве начынкі падсольваем на смак.

Пачынаем збіраць курнік. Для пачатку дастаем з халадзільніка цеста, аддзяляем крыху больш за чвэрць і раскачваем аладку дыяметрам крыху большым, чым нашы бліны. Кладзем на бляху. Зверху — траціну рысавай начынкі. Накрываем блінам, на які кладзем траціну кураціны. Зноў накрываем блінам. Кладзем траціну грыбоў з цыбуляй. Чаргуем бліны і начынкі, пакуль яны не скончацца. Ад таго цеста, што засталося, пакідаем невялікі кавалак на ўпрыгажэнні, астатняе раскачваем у вялікую аладку і накрываем начынку будучага пірага. Пасярэдзіне робім адтуліну для выхаду пары. Упрыгожваем на свой густ рэшткамі цеста, змазваем жаўтком і адпраўляем у разагрэтую да 180 градусаў духоўку на паўтары гадзіны. Смачна есці!»

НАЙЛЕПШАЕ, ШТО ТАТА МОЖА ЗРАБІЦЬ ДЛЯ СВАІХ ДЗЯЦЕЙ, — ГЭТА КАХАЦЬ ІХ МАЦІ (ТЭАДОР ХЭСБЕРГ).

Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Сцюдзёны ранак на двары,
Мароз «палапіў» вокны.
І з печы кот, як дзед стары,
На свет глядзіць маркотна.

Гэтыя паэтычны радкі належаць Генадзю Мішчуку. І хоць мы з ім зусім не знаёмыя, я перакананы, што яны маглі нарадзіцца толькі ў вельмі светлай, шчырай душы. Між тым гэтая душа не раз і не два судакраналася з чалавечай бядой і горам: дваццаць гадоў Генадзь адпрацаваў пажарным-ратавальнікам на сваёй роднай Маларытчыне (вось калі, пэўна ж, яму спатрэбілася фізічная загартоўка, набытая падчас тэрміновай службы ў войсках ваенна-паветраных сіл). Праца ратавальніка не з лёгкіх, пра што сведчыць і апавяданне, якое Генадзь Мішчук даслаў на конкурс і якое прысвячае калегам па службе ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях.

Алесь БАДАК.

Генадзь МІШЧУК

ВЫРАШАЛЬНЫ КІРУНАК

ЯЎГЕН да драбніц запомніў першы дзень сваёй стажыроўкі ў пажарнай часці. На парозе іх, навабранцаў, за плячыма кожнага з каторых ужо была тэрміновая служба ў войску, ветліва сустрэў начальнік каравула — высокі статны капітан. Ідучы доўгім калідорам, ён весела і крышачку з кпінай гаварыў навічкам: «Нашы любімыя забавы — перацягванне каната, барацьба на руках і гульня ў шашкі — сіла, тактыка, інтэлект у адным флаконе; а пачнем адразу з «абкаткі танкамі» — са «штурмоўкі».

«Штурмоўка» — пад'ём на чацвёрты паверх вучэбнай вежы з дапамогай вузкіх чатырохметровых лесак са сталёвым зубастым гакам на канцы. Натхняючы моладзь, вясёлы капітан гэта практыкаванне выканаў лёгка і проста: зачапіў гакам лескі за падаконнік, за лічаныя крокі ўскочыў па ёй у аконны праём, у імгненне вока перакінуў лескі на наступны паверх...

Яўген усім целам адчуў нервовае напружанне і звычайны чалавечы страх ужо на першай палавіне свайго «ўзыходжання». Нягледзячы на «страхоўку», ён інстынктыўна прыціскаўся да тонкіх лесвічных цяцій, кожны крок рабіў асцярожна, баючыся сарвацца са стромы, а дрыготкія пальцы выдавалі яго хваляванне. Нарэшце вяршыня скарылася яму. Адзін з кагорты навабранцаў пасля гэтага выпрабавання моўчкі развярнуўся і пайшоў забіраць дакументы.

Наступным этапам навучання, пасля таго, як справы са «штурмоўкай» пачалі больш-менш ладзіцца, быў пад'ём па аўтадрабінах. І ўсё той жа вясёлы начальнік каравула, узнімаючы настрой, казаў: «Гэта ж проста песня — хуценька прабегчы трыццаць метраў угору, дакрануцца да неба і ўжо героем спусціцца ўніз». І на гэтым этапе не ўсе пераадолелі сябе. Яўген да неба дакрануўся...

СЛУЖЫЦЬ ён трапіў на вясковы пажарна-ратавальны пост. Камандзірскім рашэннем начальніка аддзела яму ў напарнікі быў назначаны Сяргей — рахманы хлопец, на пару гадоў маладзейшы за яго, адмысловы кіроўца пажарнага аўтамабіля. Хлопцы адразу сышліся характарамі і пачалі хутка ўцягвацца ў службу.

Працоўныя будні былі запоўнены да краёў: адпрацоўка нарматываў, работы па паляпшэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы, павышэнне тэарэтычных ведаў, начныя чаргаванні на пункце сувязі. Пэўна, таму, з-за гэтай мітусні, свой першы выезд на пажар Яўген не запомніў. Усё было як у сне: прыехалі, ацанілі становішча, выбралі вырашальны кірунак і, правёўшы баявое разгортванне, падалі ствол на тушэнне. Потым падаспела дапамога — яшчэ некалькі пажарных разлікаў. Усё было проста і празаічна.

Вырашальны кірунак... Аднойчы, у самым пачатку службы, падчас праверкі боегатоўнасці падраздзялення, адзін з аператыўных работнікаў запытаў у Яўгена, колькі ёсць вырашальных кірункаў, і хлопец, не раздумваючы, адказаў:

— Пяць!..

— Няправільны адказ, — сурова секануў аператыўнік. — Гэта прынцыпаў выбару вырашальнага кірунку пяць, а сам ён, як і ў жыцці, толькі адзін. Запомні і больш не памыляйся. А самы галоўны з іх... — правершчык выразна паглядзеў на Яўгена.

— ...Калі існуе пагроза жыццю чалавека, усе сілы і сродкі скіраваць на яго ратаванне, — бы з аўтамата выпаліў хлопец, паказваючы свае веды.

— А гэта — правільны адказ, таварыш сяржант, — сказаў аператыўнік і моцна паціснуў яму руку. — Служы як належыць!

З цягам часу Яўген прывык і да тэлефонных званкоў. Напачатку здавалася, што кожны з іх — выклік на чарговае здарэнне. А потым аказалася, што асноўная частка іх — звычайныя службовыя пытанні, і не варта кожны раз хвалявацца, калі раздаецца пранізлівы тэлефонны строкат. Але гэта не тычылася званкоў, якімі рэзалі начную цішыню службовых пакояў. Тут усё было наадварот. Ад кожнага з іх веяла бядой і трывогай, якая прымушала сэрца біцца хутчэй ад невядомасці таго, што неўзабаве чакае дзяжурную змену.

ТАК адбылося і ў тую лютаўскую ноч. Тэлефон зазваніў амаль апоўначы. У суседнім пакоі ўскочыў з ложка Сяргей — змена, што адпачывала. Расхваляваны жаночы голас маліў аб дапамозе: «Пажар! Ратуйце!».

Яўген здолеў крыху супакоіць жанчыну і ўдакладніць адрас месца здарэння. Большага дабіцца ён не змог — у жанчыны зноў пачалася істэрыка, і яна паклала трубку. І закруцілася. Сяргей пабег у гараж заводзіць пажарны аўтамабіль, а Яўген, на хаду апранаючы баявы рыштунак, перадаў інфармацыю ў раённы аддзел. Праз хвіліну яны імчалі па раскіслай ад лютаўскай адлігі гравійнай дарозе ў суседнюю вёску. Начную цемру расквечвала чырвонае зарыва. Раз-пораз Яўген выходзіў на сувязь з раённым дыспетчарам, паведамляючы аб тым, што назірае, і дакладваў аб сваім месцазнаходжанні. Свайго кіроўцу Сяргея ён не падганяў, той сам умела вёў аўтацыстэрну на гранічна дапушчальнай хуткасці. «Хутчэй, хутчэй!» — у такт гудзенню сірэны гучала ў галаве. Самае цяжкае — чакаць і даганяць. Самае цяжкае — хвіліны невядомасці, якія заўжды здаюцца вечнасцю.

Дом гарэў, як свечка. Полымя цалкам ахапіла дах, агонь выбіваўся з аконных праёмаў. Нягледзячы на позні час, сабраўся натоўп назіральнікаў. І пачаўся адлік. Яўген хутка перадаў інфармацыю ў аддзел і запрасіў дапамогу. Гаварыў коратка і адрывіста, каб не марнаваць часу і хутчэй прыступіць да выканання баявой задачы.

Выбіраць вырашальны кірунак доўга не прыйшлося. Не паспелі хлопцы выскачыць з машыны, як з глыбіні падворка, ад палаючай хаты, да іх падбег чалавек з разгубленым тварам і расхвалявана загаварыў, задыхаючыся ад дыму і хуткага бегу:

— Я — сусед... Там — гаспадар... З другога боку — спальня... Агонь яшчэ не ўбіўся...

Думка спрацавала імгненна.

— Сяргей! Я — туды, а ты — на падстрахоўцы. Двум нельга, я сам, сачы за абстаноўкай!..

Напарнік паспрабаваў было паспрачацца, ды Яўген яго абарваў:

— Я сказаў: сачы за абстаноўкай, ты — мае вочы, ад цябе многае залежыць. І адгані людзей, пакуль я ўключуся ў дыхальны апарат. Большая рызыка, калі пойдзем удвух. Павер...

На хаду праводзячы баявую праверку, ён скіраваўся ў бок хаты, куды паказваў сусед. Напарнік дапамагаў яму падцягваць рукаўную лінію.

Яўген ствалом разбіў аконную шыбу, адцягнуў раму і пералез праз падаконнік у пакой. Сяргей, выконваючы загад свайго камандзіра, застаўся сачыць за становішчам звонку.

УХАЦЕ было моцнае задымленне і высокая тэмпература. Яўген не бачыў сваёй рукі, якую паднёс да самога шкла панарамнай маскі. І пажарны ліхтар тут быў слабай дапамогай. За сцяной, за шчыльна зачыненымі дзвярыма і над столлю гудзела полымя. Нешта страляла і падала. На кухні грымеў посуд. Здавалася, што ўся хата, як жывая істота, білася ў смяротнай агоніі. Яўген навобмацак ішоў уздоўж сцяны пакоя. Наткнуўся на невялічкую канапу — яна была пустая. На падлозе, каля яе, таксама нікога не было. Злева намацаў ложак. Ён быў прыбраны. Піраміда з падушак рознай велічыні месцілася на ім. «Некрануты...» — адзначыў Яўген. Сяргей, які стаяў на вуліцы насупраць аконнага праёму, быў гатовы ў любую хвіліну рынуцца на дапамогу. Дыхальны апарат за плячыма сведчыў аб гэтым.

— Што там? — праз гул і трэск пракрычаў ён.

— Пакуль нічога...

Шафа цёмнай зданню стаяла ў кутку. «Нічога, яшчэ ёсць час», — супакойваў сябе Яўген. Ён стаў на калені, каб больш дасканала яшчэ раз агледзець пакой. Памацаў рукамі пад ложкам — нікога. Пуста. Гаспадара нідзе няма. Няўжо ўсё дарэмна?!

— Выходзь! Хутчэй выходзь! Вельмі небяспечна! — знадворку галосна пракрычаў Сяргей і пачаў стукаць абухом сякеры па сцяне, пазначаючы Яўгену месца выхаду.

Яны толькі паспелі адцягнуць рукаўную лінію, як з трэскам абваліўся франтон, і частка даху, прабіваючы столь, увалілася ў хату. На дапамогу прыехалі яшчэ некалькі пажарных разлікаў на чале з начальнікам аддзела.

Яўген пачаў дакладваць яму аб выніках разведкі, ды той сурова яго абарваў.

— Чаму сам? Чаму сам, я ў цябе пытаю? Хто табе даў права парушаць статут і тэхніку бяспекі?..

— Не час нешта тлумачыць, таварыш маёр, — стомленым голасам адказаў Яўген. — Дазвольце працягваць выкананне баявой задачы.

Начальнік разгневана махнуў рукой і пайшоў да радка пажарных машын, дзе ва ўсю кіпела работа. Байцы, разбіўшы перыметр на баявыя ўчасткі, прыступілі да актыўнага тушэння пажару.

...Гаспадара хаты знайшлі пры разборцы завалаў у суседнім пакоі. Менавіта там быў ачаг пажару, самае яго пекла. Чалавек загінуў яшчэ ў першыя хвіліны трагедыі, і Яўген ніяк не мог яму дапамагчы.

Аднак гэта не суцешыла хлопца...

ФАБЕРЖЭ НА МЯЖЫ

Музей «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці» прадставіў абноўленую экспазіцыю

Ёсць у Брэсце музей, экспазіцыю якога складаюць прадметы мастацтва, што ў свой час былі канфіскаваныя мытняй пры спробе незаконнага перамяшчэння. Мастацкія каштоўнасці затрымліваюць на мяжы рэгулярна. Часам удаецца ўстанавіць сапраўднага гаспадара рэчы, тады яна вяртаецца музею ці галерэі. Але ж нярэдка факт перамяшчэння носіць крымінальны характар, і ніхто не спяшаецца заяўляць свае правы. Тады карціна альбо ікона, посуд ці сувенір застаюцца. Вось з такіх экспанатаў склаўся больш за чвэрць стагоддзя таму музей.

Цяпер тут захоўваюцца работы Айвазоўскага, Урубеля, Броннікава, Лежэ, абразы пачынаючы з эпохі Сярэднявечча, шэдэўры фірмы Фабержэ і шмат іншага, цікавага і прыгожага. Культурная ўстанова размешчана ў самым цэнтры горада, у асабняку, узведзеным яшчэ за польскім часам.

Дык вось пасля таго, як у 2009 годзе адзначылі 20-гадовы юбілей «Выратаваных каштоўнасцяў», было аб'яўлена аб капітальным рамонце і грунтоўным абнаўленні экспазіцыі. Праўда, на рамонт музей не закрывалі, работы ў памяшканнях працягваліся паэтапна. Зусім нядаўна калектыў музея прадставіў наведвальнікам сапраўды абноўленую экспазіцыю.

На прэзентацыі-адкрыцці **дырэктар музея Ірына ТАРЫМА** шмат цікавага расказала пра асобныя экспанаты. Кантрабандысты ж прыдумваюць самыя розныя спосабы, каб схаваць рэч ад памежнага і мытнага дагляду. Каштоўнасці везлі ў падушках, кнігах, кантэйнерах і бляшанках ад кавы. Вялікія карціны альбо абразы, здаралася, распілоўвалі на часткі. Не пашанцавала, напрыклад, абразу святога Уласія Севасційскага. Зламыснікі распілавалі ікону на шэсць частак. Вертыкальны разрэз прыйшоўся якраз на выяву святога. Нядаўна абраз рэстаўравалі. Яго можна ўбачыць у музеі.

Ірына ТАРЫМА праводзіць экскурсію.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Ірына Тарыма заўважыла, што абразоў XVIII—XIX стагоддзяў шмат, але амаль уся калекцыя патрабуе рэстаўрацыі. Працэс паціху ідзе. І ў зале рускага іканапісу зараз упершыню выстаўлены рэдкія абразы «Трыёдзь цвятная», «Увераванне Фамы», «Саюзам любові звязаныя апосталы». Ёсць у брэсцкай «выратаванцы» вельмі рэдкія ўзоры ікон з подпісам аўтара. У іх ліку адзін з двух вядомых абразоў Васіля Фятцова (другі знаходзіцца ў Маскве).

У музеі маецца зала, прысвечаная краінам Усходу, дзе прадстаўлена нават мастацтва будызму. Акрамя агульнай экскурсіі тут можна замовіць тэматычныя прагляды.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

Экспанаты музея.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

Продавец: филиал №3 открытого акционерного общества «Белремстройсвязь», г. Витебск, ул. 4-я Заслонова, 4а, тел. 8 0212 60-18-54

Лот №1. Трактор МТЗ-82, двигатель Д240 №588487, 1989 г.в., рег. знак ВА0814. **Начальная цена:** 32 500 000 бел. руб. без учета НДС. **Размер задатка:** 3 250 000 бел. руб.

Лот №2. Грузовой бортовой автомобиль GAZ-3307, 1991 г.в., цвет синий, рег. знак 3971ВТП. **Начальная цена:** 13 680 000 бел. руб. без учета НДС. **Размер задатка:** 1 368 000 бел. руб.

Лот №3. Грузовой бортовой тентовый автомобиль GAZ-33023 212, 2003 г.в., цвет белый, регистрационный знак ВВ0386. **Начальная цена:** 14 155 200 бел. руб. без учета НДС. **Размер задатка:** 1 415 000 бел. руб.

Повторный аукцион состоится **22.03.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: **с 10.03.2016 с 8.30 по 21.03.2016 до 17.30.** Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: оплата НДС в размере 20% от цены продажи имущества. Извещение опубликовано в газете «Звязда» 05.11.2015.

Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Объекты находятся по адресу: г. Витебск, ул. 4-я Заслонова, 4а. **Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует:

В извещение о проведении открытого аукциона по продаже объектов недвижимого имущества, принадлежащих ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», опубликованное в газете «Звязда» от **02.03.2016**, вносится изменение: **срок подписания** договора купли продажи **читать: 30** рабочих дней после проведения аукциона

Контактные телефоны	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by. Сайт: www.cpo.by**

УНП 191021390

ОАО «Вишневка-2010»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31.12.2015 г.

АКТИВЫ	Код строки	На 31.12.2015 года	На 31.12.2014 года
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	**41 231**	**39 516**
Нематериальные активы	120		
Вложения в долгосрочные активы	140	**1 023**	**1 015**
Долгосрочные финансовые вложения	150	**37**	**37**
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	**9 586**	**8 624**
ИТОГО по разделу I	**190**	**51 877**	**49 192**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	**57 702**	**50 272**
В том числе:			
материалы	211	**15 118**	**11 017**
животные на выращивании и откорме	212	**26 577**	**33 677**
незавершенное производство	213	**15 919**	**5 500**
готовая продукция и товары	214	**88**	**78**
Расходы будущих периодов	230	**9 022**	**534**
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	**5 011**	**2 762**
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	**1 835**	**2 935**
Денежные средства и их эквиваленты	270	**306**	**123**
Прочие краткосрочные активы	280	**6**	**48**
ИТОГО по разделу II	**290**	**74 486**	**57 278**
БАЛАНС	**300**	**126 363**	**106 470**
Собственный капитал и обязательства	**Код строки**	**На 31.12.2015 года**	**На 31.12.2014 года**
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	**57 423**	**47 090**
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104		
расходы по инвестиционной деятельности	110	**955**	**4 129**
В том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	**955**	**4129**
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112		
Доходы по финансовой деятельности	120	**2 152**	**850**
В том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	**2 152**	
прочие доходы по финансовой деятельности	122		**850**
Расходы по финансовой деятельности	130		**850**
В том числе проценты к уплате	131		
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132		**850**
прочие расходы по финансовой деятельности	133		

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2015 год

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2015 г.	За январь–декабрь 2014 г.
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130)	140	**3 014**	**1 275**
Прибыль (убыток) до налогообложения (+/- 090 +/- 140)	150	**230**	**- 8 923**
Чистая прибыль (убыток) (+/- 150 - 160 +/- 170 +/- 180 - 190 - 200)	210	**230**	**- 8 923**
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220		
Совокупная прибыль (убыток) (+/- 210 +/- 220 +/- 230)	240	**230**	**- 8 923**
Количество организаций, получивших прибыль по конечному финансовому результату	270	**1**	
Сумма полученной прибыли по конечному финансовому результату	270а	**230**	

Информация об открытом акционерном обществе.
Доля государства в Уставном фонде эмитента на 08.02.2016 г. составляет 92%.

УНН 600041880

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Лот №1.** Капитальное строение (здание железобетонное) с инв. №200/С-95909 общей площадью 92,3 м² стоимостью 1 268 000 000 белорусских рублей. **Лот №2.** Капитальное строение (проходная на автостоянке) с инв. №200/С-95910 общей площадью 4,8 м² стоимостью 16 000 000 белорусских рублей
Собственник (владелец) имущества	ОАО «ВИСТАН» (УНП 300029332)
Наличие обременений	отсутствуют
Местонахождение (адрес) имущества	г. Витебск, ул. Димитрова, 36/25 и 36/28
Место (адрес), дата и время проведения торгов	22.03.2016 в 12.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3
Справочная информация об организаторе торгов	Управление принудительного исполнения ГУЮ Витблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1) www.vitebskjust.gov.by Судебный исполнитель Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс (80212) 614021, 8 (033) 6879148
